Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і МГК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

ЛІПЕНЬ 24 1933 г. ПАНЯДЗЕЛАК № 161 (4705)

Год выданьня XVI

Пралетары ўсіх краёў, злучайцес

Усім райкомам, ячэйкам КП(б)Б, ЛКСМБ, палітаддзелам МТС, саўгасаў

29 ліпеня, роўна а 8-гадзіне ўвечары, ЦК КП(б)Б праводзіць Усебеларускую радыё-нараду партыйнага, камсамольскага, калгаснага, сельсавецкага актыву па пытаньнях правядзеньня ўборочнай кампаніі і датэрміновай здачы дзяржаве хлеба.

На нарадзе выступіць сакратар ЦК КП(б) тав. ГІКАЛО

Арганізуйце шырокае масава-калектыўнае сл ханьне. Забясьпечце выкарыстоўваньне ўсіх рады прыёмнікаў, радыё-кропак. ЦК КП(б)

ПЕРШЫ ЎСЕБЕЛАРУСКІ ЗЬЛЁТ СТАРШЫНЬ ПЕРАДАВЫХ СЕЛЬСАВЕТАЎ

адбудзецца

25-га ліпеня 1933 году, а 4-й гадзіне дня, у клюбе Карла Маркса (гор. Менск, рог вул. Энгельса і Карла Маркса)

ВЫДАЧА МАНДАТАЎ ДЭЛЕГАТАМ ЗЬЛЁТУ БУДЗЕ ЎТВАРАЦЦА Ў ЦЭНТРАЛЬНЫМ ДОМЕ СЕЛЯНІНА

Члены ЦК КП(б)В, ЦКК, ЦВК, СНК, члены прэзыдыуму Менгарсавету, прэзыдыуму ЦСПСБ, члены бюро Менгаркому КП(б)Б, члены прэзыдыуму МенГарКК, члены праўленьня Менгарпрафсавету, члены бюро ЦК ЛКСМБ і члены бюро Менгаркому ЛКСМБ праходзяць на пасяджэньні зьлёту па сваіх мандатах.

Уваход астатніх асоб — па спэцыяльна разасланых запрашальных білетах.

Сакратар ЦВК БССР **М. ГНІЛЯНЕВІЧ.**

1-га жніўня—усебеларускі чырвоны абоз са збожжа.

ДА СУРОВАЙ АДКАЗНАСЬЦІ ПАРУШЫЦЕЛЯЎ ЗАКОНУ УРАДУ І ПАРТЫІ АБ ЦЬВЕРДЫХ ПАСТАЎКАХ ЗБОЖЖА

„Забараніць усім бяз выключэньня органам улады, у тым ліку і загатоўчым арганізацыям, устанаўляць для калгасаў і аднаасобных гаспадар сустрэчныя планы збожжапаставак і папярэдзіць усе партыйныя і савецкія арганізацыі, што асобы, вінаватыя ў дачы сустрэчных пляна будуць прыцягвацца да крымінальнай адказнасьці“ (З пастановы СНК СССР і ЦК УсеКП(б) ад 20 чэрвеня 1933 году)

Клясавыя ворагі і іх сустрэчныя пляны

Мы ўступілі ў паласу ўборкі ўраджаю і збожжазагатовак. Новы закон аб цьвёрдых пастаўках карэнным чынам зьмяніў умовы і мэтады загатовак. Калі ў мінулыя гады збожжазагатоўкі праводзіліся на аснове кантрактацыйных дагавораў і пляжаў, якія маглі абмяркоўвацца і зьмяняцца, дык у бягучым годзе пастаўка збожжа калгасамі і аднаасобнымі гаспадаркамі **ПРАВОДЗІЦЦА ПА ЦЬВЕРДЫХ І НЯЗЬМЕННЫХ НОРМАХ, УСТАНОЎЛЕНЫХ ЗАКОНАМ.** Гэта ўзмацняе і паляпшае становішча калгасаў, стварае ўстойлівасьць у гаспадарцы і забясьпечвае калгасу і аднаасобніку магчымасьць цьвёрда разьлічыць свае даходы. Новы закон выдан для таго, каб зацікавіць усю калгасную масу і працоўных аднаасобнікаў у барацьбе за посьпех сяўбы і ўборкі, за высокі ўраджай.

Масы калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў сустрэлі новы закон з вялікім уздымам і энтузіязмам, усьвядомілі яго вялізарнае гаспадарча-палітычнае значэньне і матар'яльныя выгады, якія ён ім прыносіць. Яны зразумелі, што закон накіраван да ўзмацненьня і поўнай перамогі калгаснага ладу, да таго, каб выканаць лёзунг тав. Сталіна «зрабіць усіх калгасьнікаў заможнымі».

Зусім зразумела, чаму клясавы вораг і яго агентура з такой зайдрасьцю супраціўляюцца правядзеньню новага закону, імкнуцца дыскрэдытаваць гэта важнейшае мерапрыемства партыі і ўраду. Кулак прабуе падарваць давер'е мас да новага закону з тым, каб ва што-б там ні стала перашкодзіць посьпеху цьвёрдых паставак.

Для гэтага клясавы вораг выкарыстоўвае розныя спосабы і мэтады. Адным з такіх мэтадаў дыскрэдытацыі новага закону зьяўляецца давядзеньне сустрэчных плянаў калгасам і аднаасобным гаспадаркам па здачы збожжа наперакор дырэктывам партыі і ўраду. Нядаўна ў «Правде» была апублікавана пастанова прэзыдыуму Адэскага аблвыканкому і абкому КП(б)У аб злачынных дзеяньнях кіраўнікоў Скадоўскага раёну, якія ўстанавілі калгасам сустрэчны план збожжаздачы звыш належачых па закону.

У пастанове СНК СССР і ЦК УсеКП(б) ад 20 чэрвеня 1933 г. чорным па беламу запісана: **«ЗАБАРАНІЦЬ УСІМ БЕЗ ВЫКЛЮЧЭНЬНЯ ОРГАНАМ УЛАДЫ, У ТЫМ ЛІКУ І ЗАГАТОЎЧЫМ АРГАНІЗАЦЫЯМ, УСТАНАЎЛЯЦЬ ДЛЯ КАЛГАСАЎ І АДНААСОБНЫХ ГАСПАДАРАК СУСТРЭЧНЫЯ ПЛЯНЫ ЗБОЖЖАПАСТАВАК І ПАПЯРЭДЗІЦЬ УСЕ ПАРТЫЙНЫЯ І САВЕЦКІЯ АРГАНІЗАЦЫІ, ШТО АСОБЫ, ВІНАВАТЫЯ Ў ДАЧЫ СУСТРЭЧНЫХ ПЛЯНАЎ, БУДУЦЬ ПРЫЦЯГВАЦЦА ДА КРЫМІНАЛЬНАЙ АДКАЗНАСЬЦІ».**

І аднак, знаходзяцца людзі, якія да зваляюць сабе парушыць гэту цьвёрдую дырэктыву СНК СССР і ЦК УсеКП(б). У даным выпадку гутарка ідзе **АБ ЯРОМКАЎСКІМ СЕЛЬСАВЕЦЕ, АРШАНСКАГА РАЁНУ.** Гэты сельсавет стаў адкрыта на шлях кулацкай дыскрэдытацыі новага закону аб цьвёрдых пастаўках, на шлях грубага парушэньня пастановы ўраду і ЦК партыі ад 20 чэрвеня.

Ёсьць у гэтым сельсавеце калгасы, якія праваліл плян асеньняй сяўбы, але ёсьць і такія калгасы, як **«ЧЫРВОНЫЯ ЯРОМКАВІЧЫ»**, якія з посьпехам правялі сяўбу азімых. Калгас **«ЧЫРВОНЫЯ ЯРОМКАВІЧЫ»** засеяў звыш пляну 10 гектараў—замест 68 га жыта, вызначаных заданьнем, засеяна 78 га. Здавалася-б, што абавязацельства па цьвёрдых пастаўках гэтаму калгасу трэба было налічыць з разьліку перавыкананага пляну. Аднак, Яромкаўскі сельсавет знайшоў магчымасьць **АБЫЙСЬЦІ ЗАКОН УРАДУ І ЦК** і давесьці калгасу «Чырвоныя Яромкавічы» **СУСТРЭЧНЫ ПЛЯН** па пастаўцы збожжа з тым, **КАБ НА ГЭТЫ КАЛГАС УЗВАЛІЦЬ ЗДАЧУ ДЗЯРЖАВЕ ЗБОЖЖА І ЗА АДСТАЛЫЯ КАЛГАСЫ.**

Каб замаскаваць гэта злоснае парушэньне закону, старшыня сельсавету **МЯЖУЕЎ** пусьціўся на хітрую камбінацыю. Ён пабаяўся адкрыта павялічыць калгасу разьмер збожжаздачы ў колькасных паказальніках. **МЯЖУЕЎ ШТУЧНА ПАВЯЛІЧЫЎ РАЗЬМЕР ЗАСЕЯНАЙ КАЛГАСАМ ПЛОШЧЫ З 78 ДА 93 ГА.** Іншымі словамі, калгасу загадана здаваць збожжа **ЗВЫШ УСТАНОЎЛЕНАЙ УРАДАМ НОРМЫ** з няіснуючых 15 га.

Гэта абураючае скрыўленьне дырэктывы партыі і ўраду, дапушчанае Яромкаўскім сельсаветам, шырока вы карыстоўваецца клясава-варожымі кулацкімі элемэнтамі, якія разгортваюць агітацыю сярод калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў супроць новага закону аб цьвёрдых пастаўках. «Колькі ня сей, усё роўна ўсё забярэ дзяржава»—такую антысавецкую хлусьню пашыраюць кулакі сярод працоўнага насельніцтва. **ЯРОМКАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ І ЯГО СТАРШЫНЯ МЯЖУЕЎ ЗЬЯЎЛЯЮЦЦА Ў ДАНЫМ ВЫПАДКУ ПРОСТЫМІ ДАПАМОЖНІКАМІ КУЛАКА, ЗЛОСНЫМІ ЗРЫЎШЧЫКАМІ І САБАТАЖНІКАМІ НОВАГА ЗАКОНУ АБ ЦЬВЕРДЫХ ПАСТАЎКАХ.**

Гэтыя кулацкія агенты павінны **СУРОВА АДКАЗАЦЬ ЗА ПАРУШЭНЬНЕ ЗАКОНУ ЎРАДУ І ПАРТЫІ.** Нікому не дазволена абыходзіць законы, якія выдаюцца рабоча-сялянскім урадам. **ЗАКОН АБ ЦЬВЕРДЫХ ПАСТАЎКАХ ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА ЦЬВЕРДЫМ, НЕПАХІСНЫМ, БЯСПРЭЧНЫМ ЗАКОНАМ ЯК ДЛЯ КАЛГАСАЎ І АДНААСОБНІКАЎ, ТАК І ДЛЯ УСІХ БЕЗ ВЫКЛЮЧЭНЬНЯ ОРГАНАЎ УЛАДЫ.** Кулацкаеахвосьце з Яромкаўскага сельсавету павінна быць прыцягнута да крымінальнай адказнасьці. Абавязацельствы, выпісаныя, з дазволу сказаць, кіраўнікамі Яромкаўскага сельсавету, трэба ўважліва праверыць і выправіць дапушчаныя парушэньні дырэктыў партыі і ўраду.

С. Г—н.

КУЛАЦКАЯ МАТЭМАТЫКА...

(Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта).

У Дзяржынскім раёна мяркуюць, што ўраджай жыта з аднаго гектара ў гэтым годзе будзе складаць 9-10 цэнтнэраў.

Гэтыя меркаваньні абвяргаюцца вопытнымі калгасьнікамі - практыкамі. Старшыня калгасу «Перамога» тав. **Гарэлік** заяўляе:

— Я добра ведаю, што ў нашым калгасе ўраджай жыта будзе ў сярэднім 11 цэнтнэраў з гектара. Па азімай пшаніцы мы атрымаем 12 цэнтнэраў з га.

Калгас «Перамога» у прысланых райёна вестках перакрыў меркаваньні апошняга.

Не адстаў і калгас «Бальшавіцкая сяўба».

Калгасьнікі нашага калгасу,—гаворыць тав. Даніловіч, старшыня калгасу,—атрымаюць па 12 кгр. збожжавых культур на працадзень. Калі мы добра і бяз страт убярэм ураджай, лёзунг тав. Сталіна—зрабіць калгасьнікаў заможнымі у нашым калгасе у асноўным будзе выкананы.

Гэтыя перадавыя калгасы паказалі прыклад ва ўсіх кампаніях—па ўзьнятьці папару, па праполцы збожжавых і гародніх культур. Яны выканалі ў тэрмін, пляны сенаўборкі, падрыхтавалі машыны і інвэнтар да ўборкі збожжавых.

Але побач з перадавікамі ў радзе месц яшчэ ёсьць спробы ашукаць дзяржаву, урваць ад яе як мага больш і даць ёй як мага менш. Вось, напрыклад, **саўгас імя Чарвякова** (На васёлкі). Дырэктар саўгасу **Радзюк** прадставіў яўна перапаменшаныя весткі аб ураджаі бягучага году. У яго выйшла, што з гэктара жыта будзе ня больш 8 цэнтнэраў.

За ўтойваньне сапраўднага разьмеру ўраджайнасьці выключан з партыі старшыня калгасу імя Крупскай **Лукашэвіч.** Райвыканкомам прыцягнуты да крымінальнай адказнасьці за перамаўшаньне разьмеру ўраджайнасьці старшыні калгасаў **«Трыбуна Радзецка»** (Паланевіцкі сельсавет), **«Ударнік»** і **«Шлях сацыялізму»** (Бароўскі сельсавет).

Аднак, раённыя арганізацыі не мабілізавалі вакол гэтых фактаў увагі парт'ячэек сельсаветаў і калгасаў і абмежаваліся толькі фармальным вынясеньнем пастаноў. Загадчык райза тав. **Забалоціц** на пытаньне: што вамі зроблена для выкрыцьця да канца ашуканцаў дзяржавы,—толькі разводзіць рукамі, а канкрэтнага і яснага адказу даць ня можа.

Ашуканць дзяржаву, перапаменшыць разьмер ураджайнасьці—гэта ўлюбёны мэтад агентаў клясавага ворага, якія прыкладаюць усе сілы, каб сарваць мерапрыемствы партыі і ўраду, падарваць давер'е мас калгасьнікаў да закону аб цьвёрдых пастаўках.

Манэўры клясавага ворага заключаюцца і ў спробах даказаць, што ў аднаасобных гаспадарках ураджай атрымліваецца больш высокі, чым у калгасах. Так старшыня **Навасадзкага** сельсавету **Зварыка** даў наступныя зьвесткі аб ураджайнасьці ў аднаасобным сэктары: **жыта 8 цэнт. гэктару, пшаніцы—8 цэнт., аўса—цэнт., ячменю—11 цэнт.** У той-жа час па раду калгасаў гэтага-ж сельсавету разьмер ураджайнасьці паказана значна ніжэй. Старшыня калгаса «Пралетары» **Голуб** кажа:

— Пшаніцы яравой больш 7 цэнт з гэктару ня будзе, аўса і ячменю таксама, а азімых не зьбярэш больш за 2 цэнт.

Калгасьнікі калгасу «Пралетары» абураны гэтымі «матэматычнымі вы лічэньнямі» свайго старшыні:

— Добрая справа,—кажуць яны,—пасеялі паўтара цэнт., а зьбярэм толькі 2 цэнт. Дык гэта-ж бубка бубкі и радзіла-б! А па нашаму з кожнага гэктару будзе ня менш 10 цэнт., а асобных месцох будзе і 12 цэнтнэраў.

Памяншэньнем разьмеру ўраджайнасьці Голуб разваліў працоўную дысцыпліну ў калгасе. Зараз ён выключан з партыі і фармальна зьнят з работы. Аднак Голуб ўжо другі месяц працуе далей на пасадзе старшыні праводзіць сваю кулацкую палітыку.

Зьнят з работы, але таксама ўжо звыш месяцу працягвае працаваць на той жа пасадзе і старшыня Навасадзкага сельсавету **Зварыка.** Гэтыя факты сьведчаць аб тым, што раённыя арганізацыі не ажыцьцяўляюць да канца вынесеныя імі-ж пастановы.

* * *

Дзяржынскі раён мае ўсе магчымасьці быць перадавым раёнам у БССР па правядзеньні гаспадарча-палітычных кампаній. Для гэтага неабходна толькі ўзмацніць канкрэтнае кіраўніцтва сельсаветамі, калгасамі і саўгасамі, павесьці бязьлітасную барацьбу з перараджэнцамі, кулацкімі агентамі, якія імкнуцца ашукаць дзяржаву.

А. МАНЬКОЎ.

Фінплян выканаць поўнасьцю і ў тэрмін

Самы разгар будаўнічага сэзону, уборка, пастаўка і загатоўка сельска-гаспадарчых прадуктаў і асеньняя сяўба—вось асаблівасьці работы ў трэцім квартале. Гэтыя асаблівасьці вызначаюць і напрамак усёй фінансавай работы ў гэтым квартале.

Да пытаньняў забясьпячэньня бесперабойнага, своечасовага і поўнага фінансаваньня будаўніцтва, уборачнай, загатоўчай і пасеўнай кампаній павінны быць прыкавана ўвага ўсіх партыйных, савецкіх, прафсаюзных і грамадзкіх арганізацый. Выкананьне гэтых задач разам з тым патрабуе асабліва выразнай работы в боку самых крэдытна-фінансавых органаў.

Першы і другі кварталы г. г. у справе выкананьня фінансавых задач у БССР далі параўнальна здавальняючыя вынікі. Мы дасягнулі значнага зруху ў справе скарачэньня нявыворчых выдаткаў, зьнижэньня сабекошту прадукцыі і ўцягненьня ў народна-гаспадарчы зварот даволі вялікіх унутраных рэсурсаў.

З выключным посьпехам праведзена рэалізацыя пазыкі другой пяцігодкі сярод рабочых, служачых і калгасьнікаў. Выкананы гадавыя пляны па даходах дзяржаўнага бюджэту на 50,1 проц. і поўгадавыя пляны па мабілізацыі сродкаў насельніцтва на 100,4 проц., на плацяжох аграмаджанага сэктару—на 103,3 проц. і ў той-жа час фінансаваньне гаспадаркі праведзена ў межах зацьверджаных праграм.

Усё гэта адкрывае перад намі новыя магчымасьці ў барацьбе за далейшае ўмацаваньне і паляпшэньне нашай фінансавай гаспадаркі.

Другая палова першага году другой пяцігодкі і асабліва трэці квартал зьяўляюцца рашаючымі для выкананьня фінплану бягучага году. Пры гэтым на вучастку мабілізацыі сродкаў насельніцтва выключную ролю набываюць сельскія плацяжы.

Бягучы год ужо ўнёс і ўносіць шмат новага ў работу на вёсцы. Карэнным чынам зьмянен характар загатовак сельска-гаспадарчых прадуктаў. Зьмянілася і сама работа сельсаветаў, адказнасьць якіх у справе выкананьня палітычна-гаспадарчых задач непамерна ўзрасла.

Усё гэта патрабуе карэннай перабудовы і фінансавай работы на вёсцы. Фінансавая работа на вёсцы павінна быць пабудавана ў адпаведнасьці з новай абстаноўкай.

Цэлы рад раёнаў, напрыклад, **Уваравіцкі, Веткаўскі, Клічаўскі, Сурасскі, Бешанковіцкі, Цедахаўскі, Талачынскі, Рэчыцкі, Жлобінскі, Асіпавіцкі** і інш. сыстэматычна, з месяца ў месяц, зрываюць і зрываюць зараз выкананьне фінансавых пляноў і асабліва па добраахвотных плацяжох.

Прычыны гэтага хаваюцца ў адсутнасьці арганізуючага ўплыву і палітычнага кантролю за фінансавай работай з боку партыйных і савецкіх арганізацый. Парадна-дэкларацыйнае кіраўніцтва, адсутнасьць праверкі выкананьня, няўмеласьць своечасова рэагаваць на факты ганебнай работы асобных сельсаветаў, партыйных і камсамольскіх ячэек—вось характарыстыка работы кіраўніцтва вышэйпаказаных раёнаў.

Толькі гэтым і нічым іншым можна растлумачыць той факт, што такі пралетарскі цэнтр, як **Магілеў,** на супасьці з месяца ў месяц правальваў і правальвае зараз выкананьне фінплану.

Зусім пярэдкі факты, калі партыйнае і савецкае кіраўніцтва асобных раёнаў дрэнную фінансавую работу імкнецца адносьці за кошт запатрасьці іншымі важнейшымі работамі, як сяўба, ворыва папару, праполка і г. д. Характэрна, што гэтыя настроі пераважна ідуць арказ з боку тых раёнаў, які праваліл ня толькі выкананьне фінплану, але і выкананьне плану сяўбы і зараз правальваюць падрыхтоўку да правядзеньня ўборачнай і загатоўчай кампаній.

Між тым перадавыя раёны змаглі спалучыць усе гэтыя важнейшыя кампаніі з пасьпяховым выкананьнем фінплану—**Менскі, Гомельскі, Бабруйскі, Лагойскі, Заслаўскі, Чэрвенскі, Вузьдзенскі** і інш.

Гэтыя раёны праводзілі фінансавую работу ў такіх-жа ўмовах, як і адсталыя, і ўсё-ж яны дабіліся ня толькі колькасных, але і якасных паказальнікаў у выкананьні фінпляну і плянаў мабілізацыі сродкаў.

Партыйныя, савецкія і грамадзкія арганізацыі гэтых раёнаў добра ўсьвядомілі дырэктыву абяднанага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б) аб тым, што «бяз суровага выкананьня фінансавага пляну немагчыма ажыцьцяўленьне не вызначаных гаспадарчых плянаў на ўсіх галінах народнай гаспадаркі», і ўсімі сіламі і сродкамі дамагаліся і дамагаюцца яе ажыцьцяўленьня.

Асабліва гэту дырэктыву прыходзіцца ня шчэ і шчэ раз нашомніць зараз, у трэцім квартале, у сувязі з тым, што ў гэтым квартале фінансавая работа павінна быць цэлыма ўвязана з уборкай ураджаю, збожжаздачай, будаўніцтвам і г. д.

Перабудова страхавой работы на вёсцы ў адпаведнасьці з пастановай ЦК УсеКП(б), перабудова работы ашчадных кас, правядзеньне кампаніі па с.-г. падатку, самаабкладаньне, завяршэньне рэалізацыі пазыкі другой пяцігодкі і забясьпячэньне паступленьня па ёй прошай—усё гэта арганічна зьвязана са збожжаўборкай і загатоўкай сельска-гаспадарчых прадуктаў, з надыходзячым ростам таваразвароту на вёсцы і ростам страховых даходаў насельніцтва.

Партыя катэгарычна патрабуе ад кожнай партыйнай і камсамольскай ячэйкі, ад кожнага сельсавету, ад кожнага камуніста і, у першую чаргу ад работнікаў фінансавай сыстэмы, сапраўднай бальшавіцкай работы.

Мала клясьціся на словах у вернасьці генэральнай лініі партыі, патрэбна гэту вернасьць даказаць на справе ў правядзеньні барацьбы за выкананьне гаспадарча-палітычных задач сацыялістычнага будаўніцтва, з якіх адной з важнейшых зьяўляецца фінансавая работа.

На выкананьне гэтай задачы павінна быць накіравана ўвага ўсёй пралетарскай грамадзкасьці. Бліскучыя вынікі работы раду раёнаў, якія з кварталу ў квартал ня толькі выконваюць, але і перавыконваюць фінансавыя пляны на колькасных і якасных паказальніках, зьяўляюцца доказам таго, што мы маем усе магчымасьці па-бальшавіцку выканаць фінансавыя задачы трэцяга кварталу.

Асноўны ўпор павінен быць зроблен на якасьць палітычна-масавай і арганізацыйнай работы, на штодзённы кантроль выкананьня, на замацаваньне надзвычай узрослага фінансавага актыву і ўцягненьне яго ў штодзённую непасрэдную работу па выкананьні фінпляну як у горадзе, так і асабліва на вёсцы.

Адной з асноўных умоў, забясьпечваючых посьпех у выкананьні фінансавых задач, зьяўляецца шырокая арганізацыя абмену вопытам і грамадзкі ўнікір адстаючым.

У гэтай справе надзвычай вялікую ролю павінен адыграць цэнтральны, раённы і мізавы друк. Усесаюзны конкурс друку, які праводзіўся ў чацьвертым квартале мінулага году і ў першым квартале гэтага году, паказаў, што друк можа зрабіць вельмі многа ў справе мабілізацыі сродкаў і выкананьня фінансавага пляну.

Задача партыйных арганізацый — забясьпечыць дзейны і актыўны ўдзел друку, а таксама камсамолу, прафсаюзаў і іншых грамадзкіх арганізацый у выкананьні фінансавых задач трэцяга кварталу.

Большы клясавай пільнасьці ў фінансавай работе ў горадзе і ў вёсцы. Большы выразнасьці і палітычнай непрымірымасьці да клясавых ворагаў і іх агентуры, якія розными спосабамі прабуюць сарваць фінансавыя мерапрыемствы партыі і ўраду. Максымум увагі ў трэцім квартале сельскім плацяжом, як фэналцыя «пазыкі другой пяцігодкі» сярод грамадзкага сэктару, сельска-гаспадарчага падатку, самаабкладаньня, страхавая кампанія, уклады ў ашчадкасы, пагашэньні, якія выраўнаюць посьпех фінпляну—і новая перамога на адным з рашаючых участкаў сацыялістычнага будаўніцтва будзе забясьпечана.

Выклік гамяльчан прымаем

Мы, камсамольцы, **Кандраценя, Грыгор'еў, Алешкевіч, Амальянскі, Васілевіч, Буткевіч, Майсак, Рамашка, Вікта, Скуратоўскі** і актыў беспартыйнай моладзі; **Калпак, Пігулеўскі** і **Верабей,** з саўгасу імя Дзяржынскага (Капыльскі раён) в вялікім здавальненьнем прымаем выклік гомельскіх рабочых і калгасьнікаў аб пабудове эскадрыльлі імя Кагановіча і падпісваемся кожны на двухдзённы заработак. Выклікаем усіх рабочых, ІТР, служачых, камсамольцаў і моладзь калгасаў Капыльшчыны.

Ударна правядзем уборку новага ўраджаю

Ва многіх раёнах БССР ужо пачалася ўборка новага ўраджаю. Калгасы і саўгасы Беларусі павінны браць прыклад з перадавікоў па ўборцы ў Савецкім саюзе.

НА ЗДЫМКУ: калёна жнявярак на палёх Караеўскага саўгасу (Закаўказьзе). Гэты саўгас першым скончыў сяўбу. За ўвесь час работы дае ўдарныя паказальнікі і цэлер вышаў на ўборку пшаніцы, перавышаючы нормы дзенных заданьняў.

Аб рабоце прамысловасьці мясцовых будматар'ялаў

Пастанова Савету Народных Камісараў Саюзу ССР

Заслухаўшы даклад упаўнаважанага СНК СССР па прамысловасьці мясцовых будматар'ялаў тав. Арджанікідзэ і паведамленьні прадстаўнікоў краявых і абласных выканаўчых камітэтаў, Савет Народных Камісараў Саюзу ССР канстатуе, што прамысловасьць мясцовых будматар'ялаў на працягу мінулых 5 месяцаў, ня гледзячы на значнае ўзмацненьне транспартнымі сродкамі і абсталяваньнем, працавала нездавальняюча, выробляючы будматар'ялаў менш, чым за адпаведны пэрыяд мінулага году.

У радзе краёў і абласьцей на пабудовах саюзнага значэньня мелася выпадкі перавышэньня кошту мясцовых будматар'ялаў у параўнаньні з фактычным коштам мінулага году, прычым па будпляцоўках маскоўскай вобласьці гэта перавышэньне насіла масавы характар.

Савет Народных Камісараў СССР адзначае, што асноўнай прычынай нездавальняючай работы прамысловасьці мясцовых будматар'ялаў зьявілася нездавальняючае кіраўніцтва абласных і краявых выканкомаў і ўпаўнаважаных НКЦП прамысловасьцю мясцовых будматар'ялаў. Асабліва нездавальняюча працавала прамысловасьць мясцовых будматар'ялаў у частцы выкананьня праграмы у Днепрапятроўскай, Уральскай і Данецкай абласьцях, в ў частцы патраненьня мясцовых будматар'ялаў у Маскоўскай вобласьці, горадзе Маскве і Горкаўскім краі.

У мэтах ліквідацыі адставаньня прамысловасьці мясцовых будматар'ялаў ад выкананьня праграмы патраненьня будаўніцтва і забясьпячэньня мясцовымі будматар'ялямі пляну будаўнічых работ, Савет Народных Камісараў Саюзу ССР, адзначаючы важнейшае значэньне справы барацьбы за выкананьне вытворчай праграмы па будматар'ялах, для забясьпячэньня ўстаноўленага партыяй і ўрадам пляну капітальных работ бягучага году, пастанаўляе:

1. Прапанаваць Масаблвыканкому і Маскоўскаму гарвыканкому ў адпаведнасьці з пастановаю СНК СССР ад 5 лютага 1933 г. неадкладна зьнізіць існуючыя цэны на будматар'ялы ня менш, чым на 10 проц. і прасачыць за выкананьнем гэтага рашэньня.

2. Ухваліць прынятыя ўпаўнаважаным СНК СССР па прамысловасьці мясцовых будматар'ялаў т. Арджанікідзэ зніжаныя тарыфы на аўтаперавозкі будматар'ялаў (загад т. Арджанікідзэ ад 17-га ліпеня 1933 г.).

3. Абавязаць гаспадарчыя наркаматы ў двухдзённы тэрмін праверыць выкананьне ўстаноўленага СНК СССР зьніжэньня цэн на мясцовыя будматар'ялы дапаможнымі прадпрыемствамі пабудоў і іншых гаспадарчых арганізацый і на вінаватых у невыкананьні напажыць спагнаньні.

4. Абавязаць бударганізацыі асаблівую ўвагу аддаць завозу на будпляцоўкі ў бліжэйшыя месяцы — да пачатку масавых збожжавых перавозак — дастатковыя для выкананьня ўстаноўленага пляну будаўніцтва запасы будаўнічых матар'ялаў.

5. У адпаведнасьці з гэтым, абавязаць камітэт СПА па перавозках у трохдзённы тэрмін разгледзець план перавозак мясцовых будматар'ялаў на 3-ці квартал 1933 г.

6. Даручыць упаўнаважанаму СНК СССР па прамысловасьці мясцовых будматар'ялаў т. Арджанікідзэ, краявым і абласным выканаўчым камітэтам, у прыватнасьці выканаўчым камітэтам 8-мі рашаючых абласьцей і краёў — Маскоўскай, Ленінградзкай, Горкаўскага, Уральскай, ЦЧВ, Харкаўскай, Днепрапятроўскай і Данецкай:

а) правядраць выкананьне ўстаноўленага пляну перавозак мясцовых будматар'ялаў;

б) прасачыць за тым, каб заключэньне дагавораў на пастаўку будматар'ялаў прамысловасьцю мясцовых будматар'ялаў будаўніцтвам было закончана не пазьней першага жніўня бягучага году;

в) прасачыць за бесьперабойным фінансаваньнем завозу неабходных запасаў мясцовых будматар'ялаў на будпляцоўкі.

7. Абавязаць трэсты і прадпрыемствы, якія вырабляюць мясцовыя будматар'ялы, забясьпечыць бесьперабойную работу прадпрыемстваў неабходнай колькасьцю рабочых, а ў прыватнасьці шляхам заключэньня не пазьней першага жніўня бягучага году дагавораў з працоўнымі ў іх калгасьнікамі.

Абавязаць краявыя і абласныя выканаўчыя камітэты аказаць неабходную дапамогу ў гэтай справе гаспадарчым арганізацыям.

8. Прапанаваць упаўнаважанаму СНК СССР па прамысловасьці мясцовых будматар'ялаў т. Арджанікідзэ, краявым і абласным выканкомам указаных 8-мі абласьцей і краёў (арт. 6) праз месяц прадставіць у Савет Працы і Абароны даклады аб выкананьні даных пастановы.

Старшыня Савету Народных Камісараў Саюзу ССР —
В. МОЛАТАЎ (СКРАБІН).
Кіраўнік справаў Савету Народных Камісараў Саюзу ССР —
І. МІРОШНІКАЎ.

ЗА МЯЖОЙ

Разгалосьсі сярод нацыянал-сацыялістаў

ЛЁНДАН, 23 (БЕЛТА). Бэрлінскі карэспандэнт **«Сэндэй Таймс»** паведамляе аб **буйных разгалосьсях сярод нацыянал-сацыялістаў.** Паводле слоў карэспандэнта, гэтыя разгалосьсі выкліканы **правалам спроб вырашэньня праблемы беспрацоўя.** Карэспандэнт указвае, што ў кіраўніцтве нацыянал-сацыялістскай партыі апасаюцца бунту «безадказных» штурмавікоў. Паводле вестак карэспандэнта, некаторыя члены габітэту выказваюцца за роспуск арганізацыі штурмавікоў, аднак супроць гэтага катэгарычна пярэчыць Гэрынг.

БЭРЛІН, 23 (БЕЛТА). Аб росьце хваляваньня ў нізавых нацыянал-сацыялістскіх арганізацыях ярка сьведчыць загад **Турынгенскага** ўраду аб мерах па барацьбе супроць **«спроб дыскрэдытаваць нацыянал-сацыялістскае кіраўніцтва».** Загад прадпісвае пракуратуры тэрмінова і з найвялікшай суровасьцю расьсьледаваць выпадкі «супраціўленьня правадыру Гітлеру».

ПАВЕТРАНАЕ УЗБРАЕНЬНЕ ГЕРМАНІІ

ПАРЫЖ, 22 (БЕЛТА). «Журналь» апублікавала 3-і артыкул Жэо Лёндана аб тайным узбраеньні Германіі. У чарговым артыкуле прыводзіцца рад вестак, якія паказваюць, што Германія прымае надзвычайныя меры для адраджэньня ваеннай авіяцыі. Так, пад кіраўніцтвам генэрала **Грымэ** створан «дзяржаўны паветрана-абарончы Саюз». («Рэйхслюфтшуцэфунд»), на які ўскладзены абавязкі арганізаваць абарону тыла і барацьбу з варожай авіяцыяй у часе вайны.

Новая арганізацыя, якая мае ўжо свае **аддзяленьні па ўсёй Германіі,** парашыла стварыць ў гарадох ва ўсіх буйных дамох паветрана-абарончыя групы, пры чым усяму насельніцтву прапаявана ў выпадку трывогі блаумоўна выконваць іх распараджэньні. Газэта заяўляе, што пушчаная бэрлінскім друкам чутка аб палёце замежных аэраплянаў над Бэрлінам 26-га чэрвеня зьяўляецца простай выдумкай, якая мае агітацыйныя мэты — прапаганду за ўзмацненьне авіяцыі. З прычыны таго, што нацыянал-сацыялістскія лідэры **пічаць недастатковым штогодны выпуск двух тысяч пілотаў,** прыняты экстранныя меры для вярбоўкі курсантаў. Пры міністэрстве авіяцыі створана спэцыяльнае ведамства па ўзбраеньні самалётаў.

Газэта „Кокумін“ рэкамэндуе японскаму ўраду актыўную садзейнасьць перагаворам аб КУЧ

ТОКІЕ, 21 (Белта). Газэта «Кокумін», камэнтуючы перагаворы аб КУЧ, заяўляе, што пакупка КУЧ зьяўляецца палітычнай праблемай, а не простай гандлёвай зьдзелкай, і што Японія зацікаўлена ў вырашэньні праблемы і павінна актыўна дапамагчы посьпеху і завяршэньню перагавораў. Канфэрэнцыя мае вялікае значэньне, і таму трэба спадзявацца, што бакі не захопяцца бесканрысьнымі юрыдычнымі спрэчкамі, ці каргамі, а пастараюцца знайсьці палітычнае вырашэньне пытаньня.

Разам з гэтым Японія не павінна абможавацца ролю простага назіральніка, а ў патрэбны час выступіць актыўна.

СССР мае намер прадаць дарогу, а Манчжоу-Го хоча купіць яе. Адсюль зьдзелка зьяўляецца як быццам чыста камэрцыйнай. На самой-жа справе СССР прадае, а Манчжоу-Го купляе дарогу па палітычных прычынах, імкнучыся ўстараніць крыніцы міжнародных трэньняў.

Выказваючыся за тое, каб японскія ўлады зрабілі «крок наперад па лініі дасягненьня палітычнага вырашэньня праблемы», газэта заканчвае артыкул наступнаю характэрнаю заявай: «Адкрыта гаворачы, замежная палітыка Манчжоу-Го—гэта замежная палітыка Японіі, і яна можа быць эфэктыўнай толькі ў тым выпадку, калі знаходзіцца пад кіраўніцтвам Японіі. Няма патрэбы скрываць гэты факт. Відавочна, калі цяперашнія перагаворы сарвуцца, адносіны паміж СССР і Манчжоу-Го ўскладнацца яшчэ больш, чым калі-б канфэрэнцыя ня склікалася зусім. Калі японскія ўлады падзяляюць гэту думку, дык яны павінны ў патрэбны момант прыняць цьвёрдае рашэньне і павесьці ка фэрэнцыю да пасьпяховага завяршэньня. Трэба проста сказаць, што гэты момант ужо наступае».

Новая фальшыўка агенцтва „Дэмпо-Цусін“

ТОКІЕ, 22 (Белта). Агенцтва «СІМБУН РЭНГА» і рад японскіх газэт зьмяшчаюць, як апошнюю сэнсацыю, паведамленьне агенцтва «ДЭМПО ЦУСІН» аб тым, нібыта адбываецца «канцэнтрацыя часьцей Чырвонай арміі ў раёнах Чыты і Дэўрый для падрыхтоўкі захопу ст. Манчжурый».

Частка газэт, аднак, суправаджае гэта правакацыйнае паведамленьне камэнтары

Партыйнае будаўніцтва

Чыстку партыі на вёсцы ператварыць у магутны вагар узмацненьня тэмпаў уборкі, разгортваньня абмалоту і здачы прадукцыі дзяржаве

Чыстка адзначана ўзмацненьнем тэмпаў уборкі

ДЗЯРЖЫНСК. (Ад наш. спец. кар.). Чыстка партыйнай сэкцыі Негарэлы была прызначана на 6 гадз. увечары. Зьбіраюцца шарэнга і гэта вынікам з пазыцыі кіраўніцтва партячэйкі і рабочкому, што імі мала зроблена для растлумачэньня тых задач, якія пастаўлены партыяй у часе чыстки.

У сваім дакладзе сакратар партыйнай ячэйкі спыняецца на дасягненьнях, якія мае саўгас. І на працягу ўсяго галіны ён гаворыць выключна аб дасягненьнях.

—Ты сказаў, якія ў саўгасе ёсьць дахопы—пытае старшыня раённай камісіі на чыстцы тав. Клімковіч, і што ты практычна робіцца па падрыхтоўцы да ўборкі, як вы прапалолі ворсь, збожжавыя культуры, ці ўзялі вы пашар?

—Паспяховую закончылі на 14 дзён раней, чым у мінулым годзе. Можна сказаць, значна большага, але партыйная ячэйка працавала слаба, яму, што за год перамянілася 8 сакратароў. У камсамольскай ячэйцы таксама было 8 сакратароў. Культурнасавая работа ў часе вясенняй пашчэпкі кампаніі была разгорнута дрэнна. З 14 га гароху прасолата толькі 3 гектараў, авёс пасеяны ў кавабор. За два кварталы саўгас павінен быў дасягнуць 712 клр. сьвіноты, мяса сдаць толькі 346 клр. Усяго за ліпень пагашэнь надавучай дзеньгі. На сьвіной ферме дзеячылі клясава-варожыя элементы і гэта адчувалася ў вялікай маладзяжы: адыход маладняка дахоў да 80 процантаў.

Начальнік палітаддзелу тав. Бабцоў прыехаў у саўгас рашуча паставіць пытаньне перад кіраўніцтвам саўгасу аб ачышчэньні абслугоўваючага персаналу на сьвіноўніку ад клясавых варожых элементаў. Сакратар партыйнай ячэйкі тав. Снарскі замест актыўнай дапамогі палітаддзелу шукаў справядлівасьці, хто кім павінен кіраваць: палітаддзел ячэйкай, ці ячэйка палітаддзелам. Мала таго, Снарскі падбіраў групу работнікаў і пачынае весьці скрытую барацьбу супроць палітаддзелу. У яго групу ўваходзіць кантралёр Жук, культработнік Круг і беспартыйны намесьнік дырэктара Крукаў. Гэта група, у мэтах кампрамэтацыі начальніка палітаддзелу, выпусьціла лістоўку, у якой былі напісаны прозьвішча тых камуністаў, якіх быццам-бы палітаддзел выключыў з партыі. На таварнай ферме было сапсавана масла і група Снарскага прыпісвала гэта начальніку палітаддзела.

Ячэйка прайшла міма гэтых агідненькіх антыпартыйных паводзін Снарскага, Жука і іншых, ня выключыла іх своечасова з партыі, чым фактычна дапамагла клясава-варожым элементам шкодзіць і падрываць работу саўгасу.

Дырэктар саўгасу тав. Шчыкала таксама не дапамагаў палітаддзелу.

На пасадзе зоотэхніка стаіў былы ўладар двух млыноў нехта Шаніра. Ён сьвядома зрываў усякую работу па культурнаму вырошчаньню рабочых. Зьбярэшна група рабочых у клюб на зацятку, а Шаніра выключае электрычнасьць: Шчыкала доўга не згадзіўся з палітаддзелам, каб звольніць шкоднікаў.

Клясаваму ворагу часамі ўдавалася рабіць сваю контр-рэвалюцыйную справу, скарыстоўваючы для гэтага барацьбу супроць палітаддзелу. Аб гэтым сьведчыць такі факт: на ўцяпленьне сьвінарнікаў рабочыя прапанавалі скарыстоўзаць апілкі з свайго лесазаводу. Клясавы вораг учёс другую прапанову, скарыстаць для ўцяпленьня сьвінарнікаў мякіну. Дырэктар Шчыкала згадзіўся, 500 пудоў мякіны было скарыстана на ацяпленьне сьвінарнікаў, а клясовай ня было чым карміць жывёлу.

Усё гэта прывяло да таго, што пры слабай цягавай сіле саўгас ня мог дубрынкасна засеяць авёс. Плян па пасеву авёса недавыкананы на 12 гектараў. Вось яркі факт, які даказвае, што там, дзе не кіруем мы, бальшавікі, там кіруе клясавы вораг.

Сьвіньні доўгі кожны дзень. Былі выпадкі калі парасят душылі. Учоту парасят ня было. Яны прыходзіліся на пяты дзень пасьля іх нараджэньня і гэта давала магчымасьць воатэхніку Вялікольскаму, жонцы, высланага контр-рэвалюцыянэра Кумейшы, жонцы былога бандыта Скарабатаста, кулаку Рымашэўскаму, якія працавалі на сьвіной ферме, выводзіць са строю дзесяткі і сотні парасят. За адзін толькі 1932 год здохла сьвіней 2.790 штук. Гэта ў той час, як фермай кіравалі камуністы Сысой, Яршоў і інш.

Ёсьць у саўгасе буржуазныя перараджэнцы і двурушнікі, якія выконваюць сацыяльны заказ разьбітага, але яшчэ недабітага клясавага ворага. У ліку такіх аказаліся Снарскі, Шчыкала, Сысой, Хрэноўскі і інш., якіх выкрыла камісія на чыстцы пры дапамозе лепшых ударнікаў, беспартыйных рабочых.

Характэрным тыпам перараджэнца зьяўляецца старшыня рабочкому Хрэноўскі. Ён чырванеючы выкымае кожнае слова, прыпамінае, што ім зроблена для рэвалюцыі, але нічога прыпомніць ня мог. Старшыня праверкому тав. Клімковіч задае яму пытаньне:

—Пастановы пленуму Усе ЦСПС і ЦСПСВ вы прапрацавалі сярод рабочых?

—Як бальшавік шавінен прызнацца, што гэтых пастаноў у вочы ня бачыў.

—Члены рабочкому ўсе прымалі ўдзел у рабоце?

Не. Усё раблю я сам.

А ударнікі ў саўгасе ёсьць?

— Я было задаўся мэтай выявіць ударнікаў, але нічога ня вышла. На сёньняшні дзень ня ведаю, як гэта справа абстаіць.

— А чаму сьвіньні ў саўгасе так дохнуць?

— Прызнацца, не высьвятляў гэтага пытаньня.

Такім-жа «бальшавіком» аказаўся і старшыня рабкопу Юрчынскі, член партыі з 1932 году, які нічога не зрабіў для таго, каб палепшыць матар'яльна-бытавое абслугоўваньне рабочых. Хралюўскі, Юрчынскі, Сысой, Тарбецкі выключаны з партыі як перараджэнцы, якія не апраўдалі даверя партыі.

Але сапраўдных стойкіх бальшавікоў у саўгасе большасьць. Гэта большасьць сапраўдных бальшавікоў дапамагла ўмацоўваць саўгас. Яшчэ тры гады назад тут было зруйнаванае белапольскімі акупантамі месца. Зараз у саўгасе 1.613 гектараў зямлі, 102 коні, каля 2000 сьвіней. Саўгас набыў 4 трактары. Пабудаваны 2-х павярховы дом для кватэр рабочых. Пабудавана сталоўка, лазьня і клюб. У кожнай хаце рабочага тарыць жмяячка Ільліча.

Партыйная арганізацыя за 3 гады выраслa з 4 да 24 чалавек, такая-ж колькасьць у саўгасе і камсамольцаў. Перад правяркомам прайшлі лепшыя змагары за шабудову бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва — Левідаў, Крывабок, Лернер, Гурбо, Пятроўскі і інш., які на справе даказалі сваю здольнасьць абараняць лінію партыі. Дапушчэны ім чыстка была адзначана ударным тэмпам уборкі сенажаці і канюшыны. За 2 дні убрана 63 га сенажаці, 40 га канюшыны.

Чыстка зрабіла рашучы пералом у рабоце партарганізацыі

БЯГОМЛЬ. 18 ліпеня закончылася чыстка райпартарганізацыі За час чысткі ў раёне датэрмінова выкананы пляны ворыва папараў на 125 проц., мабілізацыі сродкаў—на 110 проц., лесавывазкі—на 110 проц. Раён выпаў у першыя рады па рэалізацыі за палучны разрахунак пазыкі сярод адпасобнікаў.

Бягомльскі раён па выкананьні ўсіх гаспадарча-палітычных кампаній на працягу-раду год займаў апошняе месца ў рэспубліцы. У гэту вясну былі зроблены першыя зрухі. Веснавую сяўбу раён скончыў у пачатку чэрвеня, даўшы высокую якасьць апрацоўкі глебы, перавыкананы плян сяўбы па ўсіх важнейшых культурах.

Чыстка партарганізацыі, вызваліўшы яе ад клясава-варожых элементаў, перараджэнцаў, двурушнікаў, яшчэ больш згуртавала і ўмацавала партыйныя рады, зрабіла іх яшчэ больш баяздольнымі, узьняла аўтарытэт партарганізацыі сярод працоўных расы.

Праверана 360 членаў і кандыдатаў партыі. Выключана з партыі 25 членаў, 49 кандыдатаў; 23 кандыдаты пераведзены ў спачуваючыя, 13 членаў пераведзены ў кандыдаты.

За час чысткі ў калгасы ўлілося некалькі сотень бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Процант калектывізацыі раёну ўзьняўся з 63 да 71.

Адначасова чысткай ускрыт рад буйнейшых прарываў у рабоце парарганізацыі. Значная колькасьць партыйных ячэек не перанесла цэнтру работы ў калгасы, у калгасныя брыгады. Невыстарчальна праходзіць перабудова ячэек у адпаведнасьці з пастановай ЦК аб палітаддзелах і калгаснай ячэйцы. Чыстка ўскрыла падмену ў радзе ячэек насавай работы голым адміністраваньнем, якое не сустракала рашучага адпору з боку райкому партыі. У раёне праваленa партыйная асьвета, у выніку чаго значная частка кажуністаў на чысткі паказала літаральна палітычную нянісьменнасьць.

Ігнаравалася работа сярод жанчын. Многія калгасы (Асаўскага, Мсьціслаўскага сельсаветаў) адмаўлялі жанчынам-калгасьніцам у рабоце. У раёне няма ні адной жанчыны па кіруючай рабоце (старшыня сельсаветаў, калгасаў).

Выкрыты буйнейшыя скажэньні ленінскай нацыянальнай палітыкі. Кемішанская партыйная ячэйка, напаўны ў палон клясава-варожых элементаў, закрыла польскую школу. Мсьціслаўская ячэйка ашальмавала лепшую калгасьніцу-ўдарніцу, дэлегатку першага ўсебеларускага зьезду калгасьнікаў-ударнікаў тав. Тарасэвіч за тое, што яна, будучы немкай, не ўладала беларускай мовай. Па гэтых фактах партарганізацыя не мабілізавала ўсіх камуністаў на рашучую барацьбу са скажэньнямі ленінскай нацыянальнай палітыкі.

Партыйны сход раёну, заслухаўшы даклад старшыні камісіі тав. Пінкіса, прыняў пастанову, у якой адзначыў вялізарную работу, праробленую камісіяй, узяў на сябе абавязак ва ўборцы і збожжанастаўцы вывесьці Бягомльскі раён у перадавыя раёны БССР. Сход паслаў прывітальную тэлеграму сакратару ЦК КП(б)Б тав. Гікало. (БЕЛТА).

ТВАР НА ЧЫСТЦЫ ПАЗНАЕЦЦА

ГОМЕЛЬ. (Ад наш. спец. кар.). Ля стала праверкому ІГНАЦЕНКА апавядаў сваю аўтабіяграфію. На гэты раз Ігнаценка зьдзіўляў прысутных добрай памяцьцю на ўсе дробязі свайго мінулага жыцьця. З асобым захапленьнем успамінаў ён юнацкія гады, калі жыў у вёсцы, гадаваўся ў сваёй матулі і працаваў на ўласнай гаспадарцы.

Надышоў 17 год. Скінулі цара.

Пераможна прагрымела прапетарская рэвалюцыя. Пачалі ўводзіцца новыя парадкі...

І ў 1920 годзе Ігнаценка ўступае ў партыю.

Ёсьць чым назірнуць Ігнаценку — да гэтай чысткі партыі ён прышоў з 13-ці гадовым партстажам.

— Чаму-жа даказаў сваю адданасьць партыі Ігнаценка на працягу прабываньня ў яе радох? — цікавіць пытаньне прысутных на праверцы, бо з усёй «трохмэтравай» прамовы, якую ён цягнуў больш за гадзіну, нічога істотнага, нічога паказнаўчага нельга было ўлавіць.

Апрача агульных фраз ад Ігнаценкі нічога не пачулі:

— Змагаўся за выкананьне дырэктыў партыі на даручаных мне вучастках работы.

Ян-жа Ігнаценка змагаўся за лінію партыі?

У публічных выступленьнях на сходах ён «граміў» і трацкістаў, і правых, і «левых», на сходах заўжды высока падымаў руку «за», а ў практычнай штодзённай рабоце і жыцьці вярхаводзіла ў яго кулацкая ідэалёгія.

Надворная маскіроўка служыла ў яго сродкам, каб увесьці ў давер'е партыі, прабіць сабе кар'еру і заняўшы месца на адказным вучастку работы, сабатаваць мерапрыемствы партыі, падрываць сацыялістычнае будаўніцтва. Ігнаценка зараз кіруе адным з буйнейшых саўгасаў на Гомельшчыне — саўгасам «ВАСІЛЬЛЕУСК». У мінулым годзе быў у складзе пленуму гомельскай РайКК. Быў выгадзен адтуль з суровай вымовай за антысэміцкую вылазку.

— Як-жа ацэньвае свой антысэміцкі ўчынак Ігнаценка,—пытае камісія. Ня хоча Ігнаценка назваць гэта сваім імем, назваць вылазкай клясавага ворага, які ўзмоцнена актывізуецца ў барацьбе супроць сацыялістычнага будаўніцтва і імкнецца пахіснуць інтэрнацыянальнае адзінства працоўных.

— Я чалавек нэрвовы і ад такіх фактаў не гарантаваны, — даслоўна заявіў Ігнаценка праверкому.

«Нэрвовай хваробай» тлумачыць ён і цкаваньне рабкораў, якія зусім правільна выкрывалі праз насьценную газэту апартуністычную практыку Ігнаценкі ў кіраўніцтве гаспадаркай. Словам, што ня пытаньне, — то і «апраўдальны» адказ. Ва ўсім значнасьце, якое тварылася ў саўгасе Ігнаценка стараннa імкнецца выгарадзіць сябе.

Тое, што ў мінулым годзе згноєна з 20 га сена, што прапажа жывёлы насіла масавы характар — Ігнаценка тлумачыць «аб'ектыўнымі» ўмовамі.

— Чаму ў самы напружаны час веснавой сяўбы, калі пляны ў саўгасе былі пастаўлены пад сур'ёзную пагрозу зрыву, вы пакінулі саўгас і пашлі адпачываць? — ва ўпор паставіла камісія пытаньне.

— Я адчуваў дрэннае становішча свайго здароўя...

Апошняе пытаньне праверкому канчаткова выкрывае сапраўдны твар «камуніста» Ігнаценка.

— Чаму правы ўхіл застаецца галоўнай небясьпекай?

— Таму, — адказвае Ігнаценка, што правых падтрымоўвае ўсё (?) сялянства.

— Дык як гэта магло здарыцца, што зараз ужо звыш 60 проц. бядняцка-серадняцкіх мас аб'ядналася ў калгасы, актыўна дапамагаючы партыі ў разгроме кулацтва як класы, а ў асноўных раёнах Савецкага саюзу закончана ўжо ў асноўным суцэльная калектывізацыя?

Гэтыя факты ня пераконваюць Ігнаценкі, ён упарта адстойвае свае кулацкія погляды.

Выкрыты да канца перад шырачэзнымі масамі правы апартунізм як кулацкая агентура, які ў сваёй барацьбе супроць генэральнай лініі партыі імкнуўся сьцягнуць партыю з ленінскага шляху сацыялістычнага будаўніцтва на шлях рэстаўрацыі капіталізму, паводле разважаньняў Ігнаценкі карыстаецца падтрыманьнем «усяго сялянства».

Больш чым ясна, што ў гэтага чалавека нічога бальшавіцкага няма. Быў толькі білет, але цяпер ён пазбаўлен яго. Махровы правы апартуніст, кулацкі агент Ігнаценка выгнан з партыі.

Я. ІВ.

Калі захапіліся складаньнем характарыстык

(АД НАШ. СПЭЦ. КАРЭСПАНДЭНТА).

ГАРАДОК. (Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта).

Партарганізацыя Гарадоцкага раёну яшчэ не разгарнула работы па падрыхтоўцы да чысткі партыі.

Усе падрыхтоўчая работа да чысткі партыі, праробленая райкампаніяй, зьвялася да абвешчаньня адзінага партдня на распрацоўцы пастановы К УсеКП(б) і ЦКК аб чысткі партыі. Гэта было два месяцы назад. Газэта «Звязда» своечасова сыгналізавала, што вынікі і гэтай цвялічкай работы не падагулены. Райком і дагэтуль нічога не зрабіў, каб выправіць дашчэнныя хібы.

Калі РКК праверыла гэту работу, дык выявілася, што ў значнай частцы парт'ячэек пастанова ЦК і ЦКК УсеКП(б) аб чысткі партыі ўсім не распрацоўвалася, а там, дзе прапрацоўвалася, дык фармальна, пасьпех, завіхорына, без вызначэньня канкрэтных перапрыемстваў. Да такіх парт'ячэек у першую чаргу адносяцца: гарадоцкая, райсамадзелаўская, МТС'аўская і іншыя.

Вось адна з буйнейшых вясковых парт'ячэек—Саладухінская. У гэтай ячэйцы пастанова ЦК і ЦКК УсеКП(б) аб чысткі партыі на агульным партходзе і сходах калгасьнікаў не распрацавана. З 13 прасавіка ў ячэйцы ня было ні аднаго агульнага партсходу. Большасьць саладухінскіх камуністаў не бачнае авангардная ролі ў калгаснай вытворчасьці, не адказвае за даручаны ім вучастак работы.

У выніку палітычнай сьлепаты ячэйкі ў калгасах арудуюць клясавы вораг. Характэрны прыклад гэтаму—калгас «Пралетары». Тут сарвалі сяўбу, саўгалюцы: «няма сямяні». А зямлі зараз выяўлена больш чым даволі. Тут кралі насеньне.

У калгасе «Набеда» кулацкія элементы заблытвалі ўліч працадзён.

Нічога гэтага парт'ячэйка не заўважала, прымірэнча адносілася да кулацкіх вылазак у калгасах.

Як у Саладухінскай, так і ў большасьці іншых парт'ячэек падрыхтоўка да чысткі партыі ня ўвязана з выкананьнем чарговых палітычна-гаспадарчых кампаній. Таму так ганебна закончана сяўба яравых (90 проц. плану); праполка вядучай тэхнічнай культуры—ільну па калгасах выкана на 75,8 проц., па аднаасобным сэктары на 37,9 проц.; па пашару—47,9 проц., касьбе—2 проц. пляну па 12 ліпеня.

Характарыстыкі на членаў і кандыдатаў партыі паегул не патрэбны і калі складаньнем такіх характарыстык захапляліся ў Гарадку, то гэта простае скажэньне інструкцыі па чысткі партыі.

Аднак, трэба паказаць, якія характарыстыкі даваліся ў Гарадоцкай арганізацыі. Напрыклад, даецца характарыстыка: «Жукаў Пятрок Андрэевіч—студэнт тэхнікуму, па сацыяльнаму паходжаньню — рабочы. Змагаецца за выкананьне дырэктыў партыі і ўраду, але ня чотка іх (дырэктывы) праводзіць у жыцьцё... Мае прыродную падарэзьвітасьць (?) і ў працэсе сваёй двухгадовай практычнай працы паказаў сябе, як нездольны (?) і павытрыманы член партыі.

У Вярэцкай парт'ячэйцы характарыстыкі на членаў і кандыдатаў партыі складзў сакратар парт'ячэйкі Барысёнак, выключаны з партыі. Такое складаньне характарыстык зьяўляецца простым апашленьнем такой важнейшай справы, як чыстка партыі. І вось складаньнем гэтых паперовых характарыстык на членаў партыі тут падмянілі ўсякую падрыхтоўчую работу да чысткі.

Замест гэтага гарадоцкая партарганізацыя павінна была разгарнуць сапраўдную самаправерку работы ячэйкі, мабілізаваць усіх камуністаў і масу беспартыйных калгасьнікаў па ажыцьцяўленьне важнейшых заданьняў партыі і ўраду па гаспадарчым умацаваньні калгасаў, ачышчэньні іх ад кулацкіх элементаў, па падрыхтоўцы да ўборачнай, чаго Гарадоцкі райком КП(б)Б яшчэ і дагэтуль не зрабіў.

Чотка арганізаваць уборку ільну

У надыходзячую ўборачную кампанію перад ільнаводчымі МТС стаіць надзвычай адказная задача—гэта поўнасьцю і ў тэрмін здаць дзяржаве прадукцыю ільну высокай якасьці. МТС павінны будуць убраць 57.000 га ільну, арганізаваць першапачатковую апрацоўку і здаць на ільназаводы 77.000 тон трэсты замест 37.000 тон, зданых у мінулым годзе.

Захоўваць усе правілы агратэхнікі і здаць дзяржаве прадукцыю высокай якасьці

Як правіла, у мінулым годзе ў большасьці МТС у часе ўборачнай многа гаварылі аб якасьці, але вельмі мала практычна што-небудзь рабілі. У гэтым годзе гутаркі павінны быць заменены канкрэтнай практычнай работай.

Каб атрымаць прадукцыю высокай якасьці, трэба па-бальшавіцку ўзяцца за сартаваньне ільну, як за адну з важнейшых умоў. Як правіла, МТС павінны будуць праводзіць уборку ў першыя раньняя жоўтай сьпеласьці на працягу 8-10 дзён. Гэта—асноўнае правіла агратэхнікі. У першую чаргу павінны будуць убірацца вучасткі найбольш высокага ільну, у другую чаргу—палёгшыя, у трэцюю—самы горшы і нізкі лён. Апрача таго, лён з аднароднай глебы павінен будзе складацца ў адно месца, бо ад папярэдніх заданьняў таксама залежыць якасьць ільну і ахова палёў ад ільнянога прыбка.

Для гэтага ўжо зараз у калгасах трэба прыступіць да вызначэньня вучасткаў ільну па яго росту, паказаць, якія вучасткі і ў якую чаргу павінны убірацца. У першыя самой уборкі таксама праводзіць сартаваньне па яго даўжыні на кожным паасобным вучастку, ня спыняючы яе і пры ўсіх наступных працэсах: мочцы, расьціле і пад'ёме трэсты.

Гэта неабходна для таго, каб нашы ільназаводы атрымлівалі прадукцыю поўнай якасьці, каб іх не загружаць нізкагатунковым сырцом, які дае выхад шанжаштоўнай прадукцыі.

Захаваньне ўсіх правіл агратэхнікі мае першачарговае значэньне. Даносі сказаць, што ў выніку ігнараваньня сартыроўкі ў мінулым годзе ільназаводы атрымалі замест 65 проц. турбінай трэсты толькі 22 проц., затое ацудзельнай — 78 проц. замест 35 проц. Якасьць здаваемай прадукцыі залежыць ад таго, як будзе арганізавана ўся работа па сартыроўцы і апрацоўцы ільну.

Трэба, каб на месцы ў калгасе было ўстаноўлена, ці крытэрыя трэста для заводзкай апрацоўкі, ці не. Нельга дапускаць пагтарэньня леташняй практыкі, калі за дзесяткі кілёмэтраў варочаліся цэлыя абозы з забракаванай трастой, па што траціліся бескарысна рабочая сіла і час.

Разьбіць антымэханізатарскія тэндэнцыі—максымальна выкарыстаць уборачныя машыны

У радзе месц машыну сустракаюць у штыхі, не жадаюць яе выкарыстаць. Контр-рэвалюцыйныя элементы імкнуліся і імкнуцца і зараз распаліць антымэханізатарскія тэндэнцыі, каб сарваць уборку і затармазіць мэханізацыю сельскай гаспадаркі. Для гэтага яны вялі сваю шкодную агітацыю аб перапрацаньцасьці машын. Але практыка леташняй уборкі паказала, што машыны цалкам рэнтабельны і ў першую чаргу сваю рэнтабельнасьць даказала ільнацерабілка.

Ільнаводчыя МТС маюць у сваім распарадкаваньні 1.156 ільнацерабілак. Па плану кожная ільнацерабілка павінна ўбрацьпя ня менш 20 га ільну. Гэта цаніфра зусім рэальная, але каб гэту магчымую рэальнасьць ператварыць у сапраўднасьць, неабходна аўладаць тэхнікай церабілкі і правільна не скарыстаць.

Чаму дрэнна працавалі ў мінулым годзе ільнацерабілкі або машыны Гільштэйна? Выключна таму, што для работы па гэтых машынах ня былі падрыхтаваны кадры, церабілкамі ўбіралі лён бяз выбару, на машынах Гільштэйна абмалочвалі снапы ільну вільгаўстаноўленага аб'ёму. Гэтыя недахопы сёлета павінны быць у корані зьведзены. Для ўборкі церабілкамі павінны быць выдзелены вучасткі ільну мэхсымальнай вышыні, а для машын Гільштэйна—звязаны снапы не таўсьцей за 10 сант. Апрача таго, ужо зараз трэба падрыхтаваць рабочых для працы на церабілках. Неабходна зьвяці і такую практыку, калі па курсах ці падрыхтоўцы кадраў абмяркоўваюцца адзаравоная разборкай і зборкай церабілкі і на гэтым заканчваецца ўся вучоба. МТС маюць магчымасьць падрыхтаваць кваліфікаваных кадры. Зараз да пачатку масавай уборкі на ўборцы звышпраднятага ільну можна і трэба навучыць калгасьнікаў працаваць на церабілцы.

Агрэгат—асноўнае зьвяно ў перыяд уборкі

Як і ва ўсякай справе, рашаючую ролю ў часе ўборкі будзе адыгрываць расстаноўка і арганізацыя рабочай сілы. У процівагу мінулага году распаўленьне машын павінна быць заменена арганізацыяй агрэгатаў з канкрэтным вытворчым заданьнем. Кожны агрэгат, які складаецца з аднаго трактара і двух церабілак, павінен ведаць свой вучастак, тэрміны ўборкі, ведаць якасьць убіраемага ільну і глебы, на якой яму прыдзецца працаваць, а тым, каб ён якасьць работы і тэрміны ўборкі аказвалі пэўныя людзі.

Адначасова перад агрэгатам стаіць задача дабіцца мінімум прастояў. У сувязі з гэтым вялізарнае значэньне набывае мерапрыемства, якое намячана нарадай дырэктароў МТС, якая адбылася ў гэтым месяцы, аб тым, каб вымушаныя прастоі церабілак выкарыстаць для падрыхтоўкі да вясны будучага году. Для гэтага агрэгаты павінны запасьціся плугамі і лушчыльнікамі, каб у часе вымушаных прастояў церабілак праводзіць трактарам ворыва і лупчэньне глебы пад пасевы ільну будучага году.

У такім-жа парадку павінна быць арганізавана работа і агрэгатаў на кожнай цэпе.

Спалучыць машынную ўборку з ручным цераблеьнем

На пледзячы на пазьнасьць значнай колькасьці ільнацерабілак, вялізарная маса ільну ў ільнаводных МТС павінна быць убрана ручным способам. Ручное цераблеьне павінна таксама праводзіцца ў першыя раньняя жоўтай сьпеласьці і быць скончана ў максымальна кароткія тэрміны.

Першая задача, якая стаіць перад МТС, гэта барацьба з кулацкім поглядам на лён, як «хлебную культуру», з уборкай якой можна пачакаць. Таварышы адказныя ўборку ільну да скапчэньня ўборкі збожжавых пазьнімі ў корані перасякацца. Ручное цераблеьне, як і машыннае, павінна быць арганізавана. Пастаянная брыгада адказвае за ўборку на сваім вучастку.

Размеркаваньне трактарных і конных агрэгатаў павінна рабіцца з улікам канкрэтных асаблівасьцяй кожнага калгасу, пазьнасьці рабочай сілы, колькасьці пасеваў і якасьці ільну. Уся свабодная рабочая сіла ў калгасах у перыяд уборкі ільну павінна быць выкарыстана для арганізацыі ручнога цераблеьня.

* * *

Асаблівасьць надыходзячай уборкі ільну заключаецца ў тым, што пасевы ў гэтым годзе праведзены ў асноўным у адзін час. Таму высьпяваньне ільну будзе праходзіць на вялікіх плошчах адначасова. Вось гэта акалічнасьць пры мушае ўсіх работнікаў МТС аддаць максымум увагі падрыхтоўчым работам, расстаноўцы сіл і арганізацыі ўборачных работ. Для таго, каб не паўтараць памылак леташняга году, усе МТС павінны своечасова падрыхтаваць і правесьці сябе арганізацыйна пробных выездаў з тым, каб забясьпечыць своечасовую здачу дзяржаве прадукцыі ў тэрмін і высокай якасьці.

М. Л.

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

* За апошні час споў пачынае наладжацца работа ўкраінскіх літургкоў на прадпрыемствах. Арганізаваны новыя літургкі—на заводзе імя Варашылава, на абутковай фабрыцы і заводзе імя Монатава. Да ўсебеларускага зьезду савецкіх пісьменьнікаў будзе выдан трэці зборнік мастацкай творчасьці ўкраінскіх рабочых-ударнікаў, зацікаўленых у літаратуру.

* Гэтымі днямі вярнулася з Магнітагорску брыгада пісьменьнікаў, накіраваная Галоўмастацтвам БССР, у склад дзе Эл. Каганэ, Б. Мікуліча і М. Гарцмана. Брыгада азнаёмілася в буйнейшым у сьвеце металюргічным камбінатам, з жыцьцём і бытам рабочых-металюргаў і камсамолі Магнітагорску. Брыгада наладзіла сувязь з магнітагорскім арткамітатам СССР. Зараз пісьменьнікі працуюць над творамі пра Магнітагорск.

* Паводле пастановы Наркамасьветы, рад мастакоў БССР выяжджае ў творчыя камандыроўкі. Так, мастак Волкаў едзе ў адзін з буйнейшых калгасаў рэспублікі для напісаньня адпаведнага палатна, мастак Пашкевіч—у чырвонаармейскія лагеры, мастак Кастэлянскі—на Бабруйскі дрэваапрацоўчы камбінат і г. д.

* 500 рабочых ударнікаў і калгасьнікаў з раёнаў БССР прынялі ўдзел у экскурсіях у Мінск за летнія месяцы, дзе яны азнаёміліся з гаспадарчым і культурным будаўніцтвам сталіцы Савецкай Беларусі.

Л. Ніхамкін

У ПАЛОНЕ У ШКОДНІКАЎ

(Да чысткі Горацкага с.-г. інстытуту).

У абстаноўцы гадамі панаваўшай грунтаўнічыны і сямейнасьці, калі самакрытыка літаральна была загнана ў падпольле і малейшае яе праўленьне рашуча выкаранялася, калі правілам доўгалетняй работы было «ня высоўсь сьмецьця з хаты» — прышлося пачаць работу камісіі па чысткі партыі ў Горацкім сельска-гаспадарчым інстытуце.

Для таго, каб разварушыць контр-рэвалюцыйнае гняздо, акапаўшайся тут групы шкоднікаў-нацдэмаў, прышчэпаўскага аховсьца, каб вывявіць іх контр-рэвалюцыйную дзейнасьць, раскапаць, высьветліць тыя абстаўкі, якія стварылі ўмовы для гэтай шкоднікай дзейнасьці, трэба было перш за ўсё разбурыць «загавор мацчаньня», які тут спаткала камісія, «разьвязань языкі», прымусіць загаварыць навуковую і студэнцкую грамадзкасьць. А для гэтага трэба было працесьці сапраўды аграмадніцкую работу, затраціць шмат энэргіі, правіць максымум настойлівасьці.

І толькі пасьля праведзенай вялікай работы ўдалося прарваць хітра сьпляценую павуціну, якой тут прыкрывалися ўсе злачынствы, усе агідненькасьці. Толькі пасьля гэтага ўдалося сарваць маскі з людзей, якія ўмелі так доўга «хаваць канцы ў ваду».

І недарэмна людзі тыпу Буткевіча і Варэнцова, супроць каго ў першую чаргу і галоўным чынам накіравана вострыё чысткі партыі, разгаравалі такую вялікую работу, каб скампрамэтаваць камісію. Недарэмна гэтыя агалцелыя вораги партыі і рабочае клясы пайшлі нават на тое, каб запужаць камісію розным пагрозамі. Яны адчувалі, што далей маскавацца, далей ашукваць партыю ня ўдасца. Яны не памыліліся, маскі з іх сарваны.

* * *

Што-ж было ў Горацкім сельска-гаспадарчым інстытуце? «Звязда» пісала ўжо аб тым, што тут на глебе шкодніцтва аб'ядналіся нацдэмакраты і трацкісты, былыя афіцэры і на працягу амаль 3-х год зрывалі работу інстытуту. Мы тут мелі моцна арганізаваны, разгорнуты і вельмі тонка завуаляваны плян шкодніцкай дзейнасьці.

Сутнасьць гэтага шкодніцтва заключалася ў тым, каб сарваць падрыхтоўку кадраў. Мэта адна і тая-ж што і ў выкрытых шкоднікаў з Наркамзему. Па сутнасьці, тут выконваўся адзіны плян, каб дасягнуць адзінай мэты — сарваць і ва ўскім выпадку затармазіць далейшую рэканструкцыю сельскай гаспадаркі, накіраваць разьвіцьцё сельскай гаспадаркі БССР па таму шляху, аб якім не памідаюць марыць нацдэмы. І калі шкоднікі з Наркамзему рабілі сваю справу шляхам насаджэньня хутароў, шкодным плянаваньнем разьвіцьця культуры і г. д., дык іх сабраты з Горацкіх інстытутаў дапаўнялі іх шляхам зрыву падрыхтоўкі кадраў спэцыялістаў для сельскай гаспадаркі, шляхам падрыхтоўкі «сваіх людзей», на якіх можна было-б абапірціся ў саўгасах, калгасах, наогул там, дзе-б яны працавалі па скончэньні інстытуту.

Прадаставім слова фактам.

У 1931 годзе існаваўшая ў Горках сельска-гаспадарчая Акадэмія была рэарганізавана ў 8 вышэйшых навучальных установ. Быў арганізаваны інстытут буйнай рагатай жывёлы з аддзяленьнямі зоатэхнічным, плянава-эканамічным і малочным. Інстытут кормаздабываньня з аддзяленьнямі агра-тэхнічным, насеньнаводзтва і кормаздабываньня. Інстытут пралезных культур з аддзяленьнямі агра-тэхнічным, плянава-эканамічным і канапляводным. Воднамэліярацыйны інстытут, інстытуты мэханізацыі сельскай гаспадаркі, лясны, сьвіналодны і садова-гародны.

На першы погляд здаецца, што ў гэтай сыстэме арганізацыі інстытутаў няма нічога дрэннага, што тут заблысьчана падрыхтоўка ўсіх спэцыяльнасьцяй, патрэбных для нашай сацыялістычнай сельскай гаспадаркі. Аднак, ці так гэта?

На самой справе факт рэарганізацыі Акадэміі зьявіўся выходным актам у выкананьні таго шкодніцкага пляну, які потым ажыцьцяўляўся на працягу амаль 3-х год.

Арганізацыя гэтых карлікавых інстытутаў, штучна адарваных адзін ад другога, наўпрэкі таму, што многія з іх зьвязаны вучэбнай базай і цэлым радам дысцыплін, патрэбна была для таго, каб разварушыць досыць моцную вучэбную базу, якая была ў Горацкай Акадэміі і каб у далейшай рабоце яшчэ больш пагыбіць ажыцьцяўленьне шкодніцкага пляну.

З 8 інстытутаў 4, а іменна — буйная рагатай жывёлы, кормаздабываньня, пралезьных культур і водна-мэліярацыйны былі заснаваны ў Горках, а астатнія былі пераведзены ў іншыя мясцовасьці. Пад шумок «рэарганізацыі і пераводу» разбураюцца абсталяваныя катэдры, лябараторыі расьлінаводзтва, фізыялёгіі расьлін, зоалёгіі і ветэрынарыі і г. д.

На месца пераведзеных інстытутаў з Магілева ў Горкі пераводзіцца агра-тэадэзычны тэхнікум і астаўляецца на месца водна-мэліярацыйны інстытут, у той час, калі гэтыя установы нікольі не зьвязаны з сельскай гаспадаркай і па вучэбнай базе і праграме ня маюць ніякай сувязі з горацкімі інстытутамі.

Увесь гэты плян рэарганізацыі, пераводаў атрымаў благасьлаўленьне ў Наркамземе і быў ажыцьцёўлен пад непасрэдным кіраўніцтвам Паніматкі і мясцовых кіраўнікоў — Буткевіча, Варанцова, Байкова. Твар, нутро гэтых людзей выкрыты ў час чысткі.

Аднак, гэта толькі пачатак. Гэтым былі зроблены толькі неабходныя прадпасылкі. Найбольшы разварот і пагыбленьне шкодніцкай дзейнасьці знайшла ў акрэсьленьні профіляй і складаньні праграм.

Распрацоўка профіляй інстытутаў была даручана нацдэму Кісьлякову. Апошні, бязумоўна, пастараўся ўкласьці ў гэтыя профілі ўсё тое, што падказвала яму яго нацдэмаўскае контр-рэвалюцыйнае нутро. Профілі інстытутаў былі складзены якраз у простую процілеглaсьць дырэктывам партыі аб падрыхтоўцы кадраў.

Задачы інстыт

Макееўскія домны перавыконваюць плян

Домны Макееўскага металюргічнага гіганта за апошні час сыстематычна перавыконваюць заданьні.

НА ЗДЫМКУ: домна № 5 і 4, якія ідуць першымі па перавыкананьні пляну.

За хутчэйшую рэалізацыю пастаноў СНК і ЦК аб чыгуначным транспарце

ДА 1-га ЖНІЎНЯ ЗАКОНЧЫЦЬ ПЕРАБУДОВУ РАБОТЫ

ЖЛОБІН, 22. (Белта).

Пастановы СНК СССР і ЦК УсеКП(б) аб рабоце чыгуначнага транспарту на Жлобінскім эксплёатацыйным раёне прапрацаваны надзвычай слаба. На сходзе вагонмайстраў (станцыя Жлобін) было ўсяго... 6 чалавек. Гэта просты выпік таго, што кінкай папярэдні масавай работы ня было праведзена. Ні ў дэпо, ні на станцыі няма лёзунгаў, прысвечаных перабудове работы.

Адны гэтыя факты сьведчаць аб палітычнай недахопы партыйнымі, гаспадарчымі і грамадскімі арганізацыямі раёну пажнейшых дакумэнтаў партыі і ўраду, аб ігнорэваньні масавай работы.

Характэрна, што за апошні час ня толькі няма паляпшэньня ў рабоце раёну, але ёсьць нават пагаршэньне. За 19 дзён ліпеня было 11 выпадкаў псаваньня паравозаў у дарозе, ліч хворых вагонаў павялічыўся ў тры разы і даходзіць да 120-140 у суткі.

Аб чым сьвядчыць гэтыя факты? Яны сьвядчыць аб тым, што рад работнікаў Жлобінскага раёну замест бальшавіцкай рэалізацыі пастановы СНК і ЦК, замест мабілізацыі мас і сапраўднай перабудовы работы на аснове гэтых пастаноў, фактычна ігнаруюць іх, чым зрываюць выкананьне вымпэльнікаў. Выкрыць гэтых апартуністаў, шкоднікаў, антысавецкія элементы, якія вядуць падрыўную работу на чыгунцы, рашуча абясшкодзіць іх — у гэтым бліжая задача партыйнай арганізацыі Жлобінскага эксплёатацыйнага раёну.

Начальнік раёну тав. АДАМАЎ тэльгі 17 ліпеня выдаў загад аб пасылцы інжынэрна - тэхнічных работнікаў з райкіраўніцтва на лінію. З 71 работніка апарату пасылаецца на лінію толькі 27. Адкак, нават і гэты лік работнікаў да 20 ліпеня поўнасьцю ня выехаў: сядзіць у канцылярыі райкіраўніцтва інжынэр ЕЎДАКІМАЎ, тэхнік ЗІНОВІЧ і інш.

Райкіраўніцтву, у прыватнасьці, начальніку раёну тав. АДАМАВУ да апошняга дня невядома, якія работнікі прыступілі ўжо да працы на лініі, якія там ім створаны ўмовы і г. д.

Па перыферыі ёсьць фанты адкрытага сабатажу радам работнікаў пастановы СНК і ЦК. У АСІПАВІЧАХ камуністы БАМБУРА, УТЛІК і АСТАШАЎ адмовіліся прыступіць да працы на новым месцы, куды яны прызначаны ў сувязі з перабудовай работы. Гэтыя «камуністы» палічылі для сябе зьняважай пайсьці на новую працу, патрабуючы больш кваліфікаванай работы. Партыйныя і грамадзкія арганізацыі адразу ня далі бальшавіцкага адпору гэтым сабатажнікам, не ўзьнялі гэтыя факты на палітычную вышыню.

Трэба адзначыць, што жлобінскі і магілеўскі райкомы партыі не аказалі нінкай дапамогі чыгунцы ў рэалізацыі пастаноў партыі і ўраду. Ня гледзячы на простую дырэктыву ЦК КП(б)Б аб дапамозе чыгуначным арганізацыям, аб пасылцы партактыву для гэтай справы на лінію, памянёныя райкомы абышлі яе. Райгазэта «Шлях сацыялізму» ўхітрылася не сказаць ні аднаго слова пра перабудову работы на чыгунцы. Яна нават не зьмясьціла пастановы ЦК і СНК.

Трэба бязьлітаса выкрыць сабатажнікаў рэалізацыі пастановы СНК і ЦК, шырока разгарнуць сапраўды бальшавіцкую барацьбу за найхутчэйшую і поўную перабудову на аснове гэтых пастаноў, дабіцца неадкладнага ўздыму работы.

У МЕНСКІМ ДЭПО НЕ КЛАПОЦЯЦЦА АБ БЫТАВЫХ УМОВАХ ПЕРАКІНУТЫХ ІНЖЫНЭРНА-ТЭХНІЧНЫХ РАБОТНІКАЎ

У Менскім дэпо адчуваецца вялікі недахоп кваліфікаваных работнікаў з інжынэрна-тэхнічнай асьветай. Даволі сказаць, што начальнік дэпо ня мае тэхнічнай асьветы, што на чале тэхнічнага бюро няма інжынэра, што большасьць брыгадзіраў (аварыя адкаго тысяма ня маюць ведаў тэхніка, каб уявіць, якую патрэбу мае дэпо ў падмацаваньні кадрамі. Адкак, райкіраўніцтва абмежавалася прысылкай толькі трох інжынэрна-тэхнічных работнікаў: аднаго інжынэра і двух тэхнікаў.

Трэба сказаць, што кіраўніцтва дэпо ня здолела стварыць прысланым работнікам належных умоў для работы. Ня гледзячы на тое, што яны прыехалі з раёну больш 2-х тыдняў, ні адзін з іх яшчэ не атрымаў кватэры, прычым, ніхто гэтым пытаньнем нават не займаецца. У выніку тэхнік Гарэцкатаеў жыве ў памяшканьні кандыдацкіх брыгад, інжынэр Лукевіч недзе прыватным чынам знайшоў пакойчык у горадзе, а тэхнік Аверын жыве ў гатэлі. Адносіны начальніка дэпо Ванцяхоўскага да гэтай справы больш чым нападлавацельскія. У гутарцы з тэхнікам Гарэцкатаевым ён проста заявіў, што пакольні Гарэцкатаеў пежанаты, дык няма чаго ёму сьпяшацца з кватэрай. Наўрад ці патрэбны камэнтары да гэтага бюракратычнага адказу.

Трэба сказаць, што тэмпы перабудовы работы дэпо не забясьпечваюць скарачэньня гэтай перабудовы да 1 жніўня. Атэстацыйная камісія толькі яшчэ пачала работу, прычым у гэтай рабоце партыйны калектыў дапусьціў грубейшыя скажэньні. Замест выдзяленьня брыгадзіраў цэхаў у паралку начальнікаў партыкалектыў парашыў правесьці гэта «дэмакратычна» і арганізаваў на агульных сходах абмеркаваньне кандыдатур з галасаваньнем, хто «за» і хто «супроць». У выніку, замест абмеркаваньня пастановы СНК і ЦК, замест мабілізацыі мас на ўзьлём работы, на ўмацаваньне працэсыпліны, на поўную перабудову работы, агульны сход зашуўся вылучэньнем новых кандыдатур, адводамі высунутых кіраўніцтвам і г. д.

Зусім зразумела, што падобная «дэмакратыя» нічога агульнага ня мае з бальшавіцкай перабудовай работы на транспарце.

Значным тормазам у рабоце дэпо зьдулецца тое, што кіраўніцтва раёну да апошняга часу ня вызначыла характару яго дзейнасьці.

Менскі гарком КП(б)Б павінен аказаць канкрэтную дапамогу дэпо ў хутчэйшай перабудове яго работы.

Падаруўскі.

„Камандыровачных з клумкамі ня бывае"...

Як толькі пачалася сплаўная кампанія, упаўнаважаны НКШС пры СНК БССР тав. Згле паслаў усім чыгуначным станцыям тэлеграму, у якой прапанаваў «прыняць усе меры для забесьпячэньня сьпеданьня плытагонаў па чыгунках без затрымкі... выдаваць ім праезныя білеты і прадстаўляць месцы ў цягніках у першую чаргу».

Трэба лічыць, што гэту тэлеграму атрымаў і начальнік станцыі Бярэзіна. Але атрымаўшы, ён пра яе на заўтра-ж забыў. Вось факты, якія сьведчаць аб гэтым. Брыгада плытагонаў Сьвіслацкага сплаўвучастку, дастаўляючы лес з прыстані Сіняя для Бабруйскага камбінату, павінна была зварочацца назад па чыгунцы. З прычыны вялікай колькасьці пасажыраў білетаў на пасажырскі цягнік да станцыі было вельмі цяжка. І калі брыгадзір тав. Белаўскі зьвярнуўся за садзейнічаньнем да начальніка станцыі, дык ён адказаў: «Білеты па-за чаргоза адпускаюцца толькі камандыровачным». Калі-ж брыгадзір паказаў яму пасьведчаньне, што яго брыгада па сутнасьці знаходзіцца ў камандыроўцы па сплаву, ён з пасьмешкай заявіў: **«У нас з клумкамі камандыровачных ня бывае».** Білетаў брыгада ў яго як у першы дзень, так і другі не атрымала, а на трэці—яна прымушана была купіць за свае ўласныя грошы плянкарты па хуткі цягнік.

Аналёгічнае зьнішча адбылося і з брыгадай тав. Пуцілы, якая дастаўляла лес да камбінату з прыстані Азярышча. Яна таксама прасядзела бяз справы на станцыі Бярэзіна два дні.

Гэтыя факты сьгналізуюць аб тым, што ў апараце станцыі Бярэзіна яшчэ моцна трымаюць свае калэньні чыноўна-бюракратычныя, саноўна-барскія адносіны да пасажыраў. Іх узначальвае сам начальнік станцыі. Што яму да таго, што сплаў зрываецца? Ён трымаецца сваіх бюрократычных правіл. Раз пасажыр не з партфэлем, а з клумкам—значыць камандыровачным быць ня можа. Нам думаецца, што Бабруйская РКК-РСІ пацікавіцца гэтай справай.

Ліпскі.
Несьцяровіч.

За злачынныя адносіны да адгрузкі падручнікаў— да судовай адказнасьці

Загад Наркамасьветы БССР ад 22 ліпеня 1933 г.

Па інфармацыі тав. ВЭНДЭ 15 ліпеня г. г. Белтранс выгрузіў на гомельскую прыстань 14 скрынак са стабільнымі падручнікамі. Гэтыя скрынкі былі выгружаны пад адкрытым небам і тры дні пяжалі пад дажджом.

Калі 18 ліпеня тры скрынкі былі ўскрыты, то падручнікі аказаліся мокрымі і фактычна сапсаванымі.

Адзначаючы гэтыя агіднейшыя факты злачынкайшых адносін да важнейшай справы загадваю:

1. Перадаць гэту справу пракурору. Прасіць сьледчыя органы правесьці сьледзтва ў тэрміновым парадку. Прыцягнуць вінаватых да судовай адказнасьці.

2. Паперадзіць усіх загадчыкаў АНА аб неабходнасьці забіраць падручнікі ў той-жа дзень, калі яны паступяць на станцыю, і што яны нясуць за выкананьне гэтага персанальную адказнасьць.

НАРОДНЫ КАМІСАР АСЬВЕТЫ БССР ЧАРНУШЭВІЧ.

Па БССР

Фізкультура і спорт

* 21 ліпеня ў клюбе імя Сталіна адбыўся вечар фізкультурнікаў гор. Менску, на якім былі падведзены вынікі гарадзкой прафсаюзнай спартакіяды па лёгкай атлетыцы.

Фізкультурнікі гораду адзначылі добрую дысцыпліінаванасьць удзельнікаў спартакіяды і выразную работу судзьдзяў. Першае месца засталося за камандай саюзу працасьветы, другое за будаўнікамі і трэцяе за варапцыльшчыкамі. Усе тры калектывы прэміяваны прызамі МГОФК і бюро ФК гарпрафсавету. Таксама атрымалі прэмі 10 высококваліфікаваных індывідуалістаў лёгкіх атлетаў і 5 лепшых інструктароў, прымаючых актыўны ўдзел у падрыхтоўцы і правядзеньні спаборніцтва.

* У сярэдзіне жніўня МГОФК арганізуе вялікія спаборніцтвы па лёгкай атлетыцы. У праграму спаборніцтваў, акрамя ўсіх відаў спорту, увахо́дзячых у комплекс «ГПА», уключана: кіданьне дыску, штурханьне ядра, бег на паўтары да пяці кілёмэтраў, скачкі з шэстам і бар'ерны бег.

Удзельнікамі спаборніцтваў будуць наступныя каманды: «Дынама», прафсаюзы, каманда Чырвонай арміі і сам-прамкаапэрацыі, у складзе 15 чалавек кожная. Каманды «Дынамо» і прафсаюзаў пачалі ўжо праводзіць сыстематычную падрыхтоўчую работу.

* Секцыя водпала спорту МГФК праводзіць шырокую падрыхтоўчую работу да ўсебеларускіх спаборніцтваў па веславаньні і плаваньні, якія адбудуцца ў канцы месяца ў Віцебску. Вылучаныя каманды сыстематычна выяжджаюць у лягеры № -скай дывізіі для адпаведнай трэніроўкі. Апошнае адборачнае спаборніцтва па права ўдзелу ў водным сьвяце адбудзецца 26 ліпеня.

Аўта-машыны—убораччай



Масюўскі завод аўтамабіляў імя Сталіна (б. АМО) ва ўдарным парадку заканчвае новую сэрыю машын, якія будуць адпраўлены ў раёны буйных насенсеўгасаў.

НА ЗДЫМКУ: канвэер новых машын на зборачнага цэху заводу імя Сталіна.

ЭЛЕКТРААБМАЛОТ У БССР

У першых пічбах жніўня ў 87 калгасах і 30 саўгасах БССР адкрываюцца электраўборачныя пункты, якія будуць праводзіць электраабмалот і электрасіпасаваньне.

Пункты адкрываюцца ў ВІЦЕБСКІМ, АРШАНСКІМ, МАГІЛЕЎСКІМ, ШКЛОЎСКІМ і ДУБРОВЕНСКІМ раёнах і будуць карыстацца электраэнэргіяй 1-ай БелДРЭС імя Сталіна.

Апрача стацыянарных пунктаў будуць працаваць 7 перасоўных трансфарматарных фургонаў. Фургонамі будуць абслугоўвацца калгасы, якія знаходзяцца на адлегласьці 1—1 з пал. кі ад электрыфікаваных гаспадарак, або электраправодных ліній.

Усяго мяркуецца абмалаціць каля 600 тыс. пудоў калгаснага збожжа і ўвесь ураджай збожжавых культур 30 буйнейшых саўгасаў і калгасаў. Поўнасьцю будзе праведзена рэзка сіпасанай масы ў тых гаспадарках, дзе будуць працаваць пункты.

Для кіраўніцтва работай на пункты выяжджаюць інжынэры-электрыкі т. т. НАХШЫН (НКЗБ), ФІЛІПОВІЧ (Трэст электрыфікацыі, і студэнты віцебскага электратэхнікуму.

Электраабмалот і электрасіпасаваньне ў БССР праводзяцца ўпяршыню. Сёлета электрыфікацыя дасьць магчымасьць вызваліць значную частку трактараў (112.000 трактара-гадзін) і перакінуць іх на ворыва. Аб'ём работы вызваляемых трактараў вымяраецца ў 34.000 га. (БЕЛТА).

ПАДРЫХТОЎКА ДА ДНЯ АВІЯЦЫІ

Культустановы (тэатры, кіно, клюбы) разгарнулі работу па падрыхтоўцы да дня авіяцыі шляхам арганізацыі ведаў і рабочых масовак. Саюзам работнікаў складзены брыгады, якія выяжджаюць у калгасы, чырвонаармейскія часьці і лягеры са спэцыяльна падрыхтаваным рэпэртуарам для на стацкіх пастановак. Вылучана брыгада, якая будзе абслугоўваць прыгарады (рабочыя пасёлкі і калгасы Менску). Белдзяржкіно арганізуе ў гарадох дэманстрацыі кінофільмаў на пляцох і ў садох у Менску ў дзень авіяцыі будуць праведзены рабочыя масоўкі і маёвацкія вечары. Зборы ад пастановак і вечароў паступяць у фонд умацаваньня авіяцыі СССР (БЕЛТА).

Аўтамат для засыпкі цьвікоў

Рабочы менскай абутковай фабрыкі імя Кагановіча тав. Пазоль вынайшоў новы апарат для аўтаматычнай засыпкі цьвікоў у абцасавы прэс машыны «Окма-Лавынг». Раней гэта работа рабілася ручным спосабам. Вынаходка тав. Пазоля дае 80 тыс. руб. эканоміі ў год. Канструкцыя апарату закончана і заказ на выраб гэтага апарату перададзены віцебскаму машынабудаўнічаму заводу «Камінтэрн».

Менскі гарсавет рыхтуецца да зьлёту старшынь перадавых сельсаветаў

Менскі гарсавет разгарнуў шырокую масавую работу па падрыхтоўцы да ўсебеларускага зьлёту старшынь перадавых сельсаветаў. Для ўдзелу ў зьлёце вылучаны старшыні трох перадавых сельсаветаў: Кайкаўскага, Трасьцянецкага і Прыгараднага, як лепшых і адна жаночына актывістка—член Караліншчанскага нацыянальнага польскага сельсавету.

Для праверкі сапраўдных дасягненняў у гэтым сельсаветы выехалі члены прэзыдыуму гарсавету, якія правядуць там папыраныя пленумы сельсаветаў і адпаведную растлумачальную і арганізацыйную работу, якая забясьпечыць выкананьне канкрэтных абавязацельстваў па правядзеньні сельсаветамі падыходзячых сельска-гаспадарчых работ, як сенаўборка, сеназдача, уборка азімых і яравых, абмалот іх і збожжаадача. Такая-ж работа пра водзіцца па ўсіх іншых сельсаветах.

Гарсаветам прапанавана радыёадзелу на працягу 2-х дзён правесьці работу радыёпунктаў, якія ёсьць у сельсаветах, калгасах, саўгасах, і шырэйшыя іх у поўную спраўнасьць з тым, каб арганізаваць спэцыяльнае трансьляваньне па радыё работы зьлёту ва ўсе сельсаветы, калгасы, хаты-чытальні і інш.

Мяркуецца таксама арганізаваць во чар сустрэчы ўдзельнікаў зьлёту з ударнікамі сэкцый, дэпутацкіх груп і шэфактывам перадавых прадпрыемстваў Менску для абмену вопытам работы. Апрача таго арганізаваць экскурсіі ўдзельнікаў зьлёту на буйныя прадпрыемствы гораду і выезд групы ўдзельнікаў зьлёту ў адны з сельсаветаў Менскага раёну для азнаямленьня з пастановкай масавай работы.

Вылучана 10 чалавек адказных работнікаў, членаў прэзыдыуму і загадчыкаў аддзелу гарсавету для правядзеньня гэтых мерапрыемстваў і актыўнага ўдзелу ў работах зьлёту, а таксама арганізацыі масавага наведваньня зьлёту дэпутацкімі групамі і актывам з сэкцый Менскага савету.

Да дня адкрыцьця зьлёту мяркуецца скончыць поўнасьцю сенаўборку і сеназдачу на ўсіх калгасах і адказасобным сэктары і ў дзень адкрыцьця зьлёту арганізаваць вялікі чырвоны абоз па здачы дзяржаве сена.

Дамо кваліфікаваныя кадры тэхнічнай базе



У калгасе «Чырвоны спэцыяліст» (Сеньненскі сельсавет, Менская МТС) праводзяцца курсы па падрыхтоўцы кадраў для уборачных машын. Курсы выпускаюць да уборачнай кампаніі 36 чалавек.

НА ЗДЫМКУ: мэханік Панкратовіч паказвае курсантам, як трэба абыходзіцца з снопавязалкай.

ПРЫКЛАД БАРАЦЬБЫ ЗА ПРАМФІНПЛЯН
ПАКАЗВАЕ ДЭПУТАЦКАЯ ГРУПА ЗАВОДУ ІМЯ ЛАНЦУЦКАГА

Гомельскі Чырвонасьцяжны паравоз-рамонтны і вагона-будаўнічы завод імя Ланцуцкага праграму 4-га заключнага году першай пяцігодкі скончыў з посьпехам. Поўнасьцю выканан і прамфінплян першага паўгодзьдзя 1933 году. Завод увесь час знаходзіцца ў першых радах прадпрыемстваў Беларусі. Сваёй ударнай работай ён адзначаў ад заводу «Пралетары» пераходны Чырвоны сьцяг імя ЦК КП(б)Б.

Значная заслуга ў гэтым належыць дэпутацкай групе заводу. Правільна зразумеўшы дырэктывы партыі, група разгарнула сваю работу на вытворчасьці. Асаблівую ўвагу яна аддае палепшаньню якасьці і зьніжэньню сабекошту прадукцыі, павышэньню прадукцыйнасьці працы.

З гэтай мэтай група праводзіць абор рацыяналізатарскіх прапаноў, якіх за паўгода сабрана звыш 150. Выпікам рэалізацыі рабочых прапаноў зьявілася значнае папыраньне асартымэнту выпушчанай хутчэй выканала заказы. У адказ на просьбу групы, Рыкаўскі гарсавет і дэпутацкая група ўжылі неабходныя меры і ў хуткім часе заказ быў выкананы і завод уніканў вымушаных прастояў. Група зварачвалася з просьбай і да Массавету, каб апошні ўзьдзейнічаў на Стальзбыт у сэнсе хутчэйшай адгрузкі сталі.

Значнае месца ў рабоце групы займае барацьба за стварэньне і ўмацаваньне ўласнай харчовай базы заводу. Група ўзяла пад сваю ўвагу прыгарадную гаспадарку. У час веснавой сяўбы ўсе члены групы актыўна прапавалі на возцы гною. Калі поле пакрылася ўсходамі, група зьвярнулася шпіцятарам актыўнай дапамогі гаспадарцы ў прапоўцы.

Група арганізавала свой кантрольны пост і ў прыгараднай гаспадарцы. Наколькі добра праводзіў работу свае гэты кантрольны пост сьведчыць хаця-б факт выкрыцьця шкодніцтва на канюшні гаспадаркі. Сярод конюхаў было шмат кулакоў, якія праводзілі тую шкодную работу. У выніку — у мінулым годзе была сарвана злучная кампанія. Сёлета з 50 кобыляк ніводная не дала прыплоду.

Апрача актыўнага ўдзелу ў рабоце заводу па непасрэднаму выкананьню прамфінплану дэпутацкая група разгарнула на скарні рабочых. Работніца т. Ермакова зьвярнулася да групы са скаргай на кіраўніка дамамі жанту, у якім яна жыве. Гэты кіраўнік вымагаў не з кватэры апушчанчыя спосабам, зазнаўшы, што кватэра прадназначана для арганізацыі. На самай-жа справе гэту кватэру ён аддаў сваёму знаёмаму. Дэпутацкая група дабілася неадкладнага суда над гэтым апушчанцам. Суд прыгаварыў яго да году пазбаўленьня волі.

Не стаіць у баку дэпутацкая група і ад фінансавай работы. Яна прымала актыўны ўдзел у рэалізацыі пазыкі другой пяцігодкі. Сваё заданьне па пазыцы завод рэалізаваў за адны суткі. У сучасны момант у падшэфным сельсавеце працуе заводская брыгада ў ліку 30 асоб. Значная частка ў брыгадзе — члены дэпутацкай групы, якія праводзяць там работу па рэалізацыі пазыкі сярод працоўных адпасобнікаў.

Уся работа дэпутацкай групы сьведчыць аб тым, што яна з гонарам апраўдае данную ёй гарсаветам назву апорнай дэпутацкай групы. Асаблівае вылучаецца сваёй работай у групе старшыня групы, стары рабочы з 28 гадовым вытворчым стажам, член КП(б)Б, тав. Таўпінскі, нам. старшыні т. Капесьнікаў, нядаўна абраны сакратаром заводзкага камсамольскага калектыву, стары рабочы т. Мархоўскі і работніца Пеклева — герой першай пяцігодкі.

Адкак, побач з добрымі бакамі ў рабоце групы ёсьць і недахопы. Першы з іх — гэта тое, што ня ўсе члены групы прымаюць актыўны ўдзел у рабоце. Аксутнічае сталая пляніраваньць і вучот. Гэтыя недахопы група павінна ва што-б там ні стала ліквідаваць і ўзьняць сваю работу на яшчэ большую вышыню.

Эдэльштэйн.

Тав. ПЕКАЛЕВА

Тав. ТАЎПІНСКІ

Агляд друку

ЗМАГАЦЦА ПА-БАЛЬШАВІЦКУ ЗА ДОБРУЮ ДАРОГУ

(„За калгасы"—орган Пухавіцкага РК КП(б)Б, РВК і РПС і „Сьцяг калектывізацыі"—орган Чачэрскага РК КП(б)Б РВК і РПС)

ЦК КП(б)Б і СНК БССР у сваіх пастановах аб месячніку дарбудаўніцтва зусім выразна акрэслілі гаспадарча-палітычнае значэньне барацьбы за добрую дарогу.

«Прызначэньне дарог у праяжджы стан і скончэньне праграмы дарожнага будаўніцтва асноўных магістраляй, — гаворыцца ў пастанове, — маюць вялізарнае палітычнае і гаспадарчае значэньне ня толькі для сьвяточасовага правядзеньня ўборачнай і загатоўчай кампаніі, але і для ўмацаваньня абароназдольнасьці краіны і росту сацыялістычнай культуры ў калгасной вёсцы».

У № 38 газэта зьмяшчае ўмовы ўсебеларускага конкурсу на лепшае правядзеньне дарожна-будаўнічых работ, заклікаючы ўсе сельсаветы, калгасы, камсамольскія і дарожныя арганізацыі ўключыцца ў конкурс. Тут-жа газэта пачынае біць на канкрэтных прыкладах работы лепшых вячэек Аўтадору — Сушчанкай, Сінецкай і інш. «З. К.» адзначае вядучую ролю Аўтадору ў барацьбе за добрую дарогу, каб адначасова паставіць пытаньне аб арганізацыі аўтадораўскіх вячэек за ўсіх калгасах і саўгасах раёну.

9 ліпеня ў № 42 газэта высоўвае задачу — выканаць плян дарожнага будаўніцтва да 15 ліпеня. У артыкуле «Зламаць сабатаж на дарбудаўніцтве» газэта вусім правільна завастрае ўвагу на тым, што вырашае справу ня толькі лік вышэйшых людзей і фурманак, а галоўнае — якасьць выкананай імі работы. Выразна ставіцца пытаньне аб якасьці работы, выкананыя і перавыкананыя нормы. Гэта газэта робіць не ізалявана, а цесна ўвязваючы з практыкай. Тут-жа падаецца прыклад, як Дукорскі сельсавет, калгас «Паляўнічы», кубамэтр пяску вывозіць на 8-мі фурманках, замест 3-х. На фурманку кладуць столькі пяску, што яго можна ўзяць у мешок і панесьці на плячох. Абвяшчаецца ганьба тым, якія выходзяць на работу ў 10-11 гадзін дня.

Нарэшце, у апошнім з прагледжаных намі нумароў (№ 43) «З. К.» дае нарыс «От, што яны бачылі», у якім у жывой форме паказвае работу выязнога пасяджэньня штабу па дарожным будаўніцтве, на якім рабіў справаздачу рад перадавых і адстаючых сельсаветаў. Паказваецца вопыт работы Сынчанскага сельсавету, які дабіўся перамогі ў дарожным будаўніцтве.

Вальшавіцкая барацьба пухавіцкай райгазэты «За калгасы» за добрую дарогу, апэрацыйнае кіраўніцтва з боку партыйных і савецкіх арганізацый, баявы ўдзел камсамольскіх і аўтадораўскіх арганізацый далі свае вынікі. Пухавіцкі раён датэрмінова выканаў свой галаны плян працэдзелу на 108 проц.

Цэнтральны штаб па дарожным будаўніцтве спэцыяльна адначыў ролю газэты «За калгасы» і прэміяваў рэдактара яе т. Міхайлава 200 рублямі.

Задача «З. К.» і раённых арганізацый — мабілізаваць масы на заканчэньне недаробак на асобных маршрутах, дабіцца 100 проц. выкарыстаньня працэдзелу ва ўсіх без выключэньня сельсаветах і калгасах, устанавіць пастаянны догляд дарог і мастоў раёну. Самая лепшая дарога, калі за ёй ня будуць глядзець, праз кароткі час зноў стане непраяжджай. Вопыт Сынчанскага сельсавету — прымацаваньне ўсіх дарог і мастоў да насельніцкіх пунктаў, ліквідацыя абязьлічкі ва ўтрыманьні дарожнай гаспадаркі — павінен быць шырока распаўсюджаны ўсімі раённымі арганізацыямі і друкам.

* * *

Чачэрскі раён ўвесь час адстае ў выкананьні дарожна-будаўнічай праграмы. На 15 ліпеня ён выканаў плян толькі на 7,7 проц. Гэта ў той час, калі паводле пастановы ЦК КП(б)Б і СНК БССР апошні тэрмін скончэньня дарожных работ з працэдзелам месяцова — 1 жніўня. Раённае кіраўніцтва праўдзе сапраўды апартуністычныя адносіны да дарожнага будаўніцтва. За апошнюю пяцідзеўку прырост склаў усяго 0,5 проц., замест 20 проц., якія патрэбны для заканчэньня плану. Раён на дарбудаўніцтву знаходзіцца на чорнай дошцы. І ўсё-ж райгазэту «Сьцяг калектывізацыі» гэта ня турбуе.

За ўвесь час са дня абвяшчэньня ЦК КП(б)Б і СНК БССР масавага выхаду рабучэсьці на дарожныя работы і потым месячніку штурму дарожнага будаўніцтва,—радзіцьця «С. К.» вымясьціла ад адну «фіксатарскую» заметку ў № 36 ад 13-га чэрвеня і на гэтым супакоілася. Агульнымі разважаньнямі, «С. К.» прызнала важнае значэньне добрых дарог; прызнала, што па раёну маецца ў дарожным будаўніцтве вялікі прарыў, што трэба падштурхнуць работу і... усё. Канкрэтных прыкладаў у арыве работ газэта не паказала, яна забылася аб тым, што пар тыяй і ўрадам «дарожная справа прыпана першачарговым абавязкам усіх партыйных, савецкіх, камсамольскіх і грамадзкіх арганізацый». Чым інакш растлумачыць, што нават пастанову ЦК КП(б)Б і СНК БССР «Аб месячніку штурму дарожнага будаўніцтва», «С. К.» не палічыў патрэбным зьмясьціць у газэце?

Недаацэнка справы дарожнага будаўніцтва, стаўка на чарговасьць кампаніі, злоснае невыкананьне дырэктывы партыі і ўраду з боку як партыйных і савецкіх арганізацый, так і раённага друку — вось што паслужыла прычынай зрыву дарожных работ на Чачэрскаму раёну. І гэты ганебнейшы прарыў усе-ж не выводзіць Чачэрскіх кіраўнікоў з раўнавагі.

* * *

На прыкладзе гэтых дзьвух газэт можна судзіць аб ролі раённага друку ў выкананьні дарожна-будаўнічага пляну. Вопыт Пухавіцкай газэты «За калгасы» павінен быць шырока падхоплен усім раённым друкам БССР. Сапраўды апэратыўным кіраўніцтвам ходам работ, мабілізацыяй калгасьнікаў, працоўных адпасобнікаў, рабсялькораўскага актыву, пісьменнай сустрэчай радзіцьці з асобнымі дарожна-будаўнічымі вучасткамі, будаўніцтвам асобных маршрутаў, штодзённай барацьбой за выхад рабучэсьці — раённы друк служыць магутным вагаром у выкананьні дарожна-будаўнічай праграмы.

Сумная практыка Чачэрскай райгазэты «Сьцяг калектывізацыі» павінна быць шерасьцярогай, як на трэба адно сіпца да выкананьня важнейшых гаспадарча-палітычных кампаніяў.

Часу засталося вельмі мала. Патрэбны сапраўды бальшавіцкія тэмпы ў рабоце, каб выканаць ва ўстаноўлены партыяй і ўрадам тэрмін плян дарожных работ. Гэта павінны ўлічыць і райгазэты.

„Манэўры клясавага ворага"

У газэце «Зьвязда» ад 19 чэрвеня г. г. быў надрукован ліст пад назвай «Манэўры клясавага ворага». Група калгасьнікаў з Бярэзінскага раёну ў гэтым лісьце выкрывала шайку кулакоў, якія прабраліся ў калгас (у вёсцы хутар), і «ціхай сапай» імкнуліся разбурыць яго.

Бярэзінская РКК-РСІ паведамляе, што факты, апісаныя ў лісьце, адпавядаюць сапраўднасьці.

На агульным сходзе калгасьнікаў Пятровіч Юстын, як кулак, з калгасу выключан і матар'ялы па яго пераданы ў сельсавет для абкладаньня ў індывідуальным парадку.

Выключан з калгасу і Верамейчык Яўмен, як заможнік, які карыстаўся ў калгас ад цьвёрдага заданьня. Верамейчыку сельсаветам зараз даведзена цьвёрдае заданьне.

Акрамя гэтага, РСІ разам з партячэйкай і сельсаветам прынялі рад канкрэтных захадаў па ўмацаваньні калгасу і забесьпячэньні ў ім бальшавіцкага кіраўніцтва.

Па сьлядох ненадрукаваных лістоў

Бабруйская РКК-РСІ паведаміла рэдакцыю, што факты аб дрэнным пастаноўцы справы ў Бабруйскім дорнае адпачынку, пра якія пісаў рабкор тав. Гарошка, адпавядаюць сапраўднасьці.

За бязьдзейнасьць у разгортваньні культасавай работы культработнік Літвінка з работы зьнят, а таксама зьнята з работы афіцыянтка Ліўштэйн—за грубыя адносіны да адпачываючых.

* * *

Група рабсялькораў Бялыніцкай МТС прыслала нам допіс аб тым, што клясавы ворог кулак Зайкоўскі П. пралез у савецкі апарат і «працуе» сакратаром райземаддзела. Бялыніцкі РК КП(б)Б паведамляе, што факт, указаны ў допісу, падцьвярджэньня. На паседжаньні бюро РК і фракцыі РВК за адсутнасьць клясавай пільнасьці ў падборы работнікаў заг. райземаддзелу т. Шчамялёў прыцягнут да партадказнасьці. Кулак Зайкоўскі з працы ў райза зьнят.

* * *

Талачынская РКК-РСІ паведамляе, што факты аб дрэнным кіраўніцтве і безгаспадарчасьці на Талачынскім плодагадным заводзе, паданыя сельскорам Уласавым, адпавядаюць сапраўднасьці. Дырэктар заводу Марусенка з работы зьнят і выключан з радоў КП(б)Б

АБ РАБОЦЕ МІЖРАЁННЫХ САУПАРТШКОЛ

Пастанова сакратарыяту ЦК КП(б)Б

1. Паставіць задачай перад саўпартшколамі падрыхтоўку кіруючых работнікаў для нізавых партыйных і камсамольскіх арганізацый, калгасаў, саўгасаў і МТС (сакратары ячэек, прапагандысты, старшыні калгасаў, брыгадзіры і інш.) у адпаведнасьці з umanymi патрэбнымі запатрабаваньнямі, якія прад'яўляюцца кіруючаму работніку на вёсны сучасным этапам сацыялістычнага будаўніцтва.

2. У мэтах павышэньня якасьці падрыхтоўкі нізавых кадраў арганізаваць па ўсіх саўпартшколах (за выключэньнем магілеўскай, якая рыхтуе савецкія кадры) наступныя аддзяленьні:

а) партаддзяленьне з 2-х гадовым тэрмінам навучаньня, на якім рыхтаваць сакратароў калгасных, саўгасных і МТС ячэек КП(б)Б, нізавых прапагандыстаў і агітатараў;

б) калгаснае аддзяленьне з 1-гадовым тэрмінам навучаньня, па падрыхтоўцы старшынь калгасаў, брыгадзіраў жывёлагадоўчых таварных фэрм і інш.;

в) камсамольскае аддзяленьне з 1-гадовым тэрмінам навучаньня па падрыхтоўцы сакратароў ячэек ЛКСМБ у саўгасах, калгасах і МТС і прапаработнікаў для камсамольскай сеткі і палітасьветы.

3. Умовы прыёму на асобныя аддзяленьні ўстанавіць наступныя:

а) на 2-хгадовае — прымаць членаў КП(б)Б, якія падрыхтаваны ў абёме пачатковай партшколы, умеюць чытаць, пісаць і вядуць чатыры дзеі арытмэтыкі;

б) на калгаснае аддзяленьне прымаць членаў і кандыдатаў КП(б)Б, спачуваючых, камсамольцаў і беспартыйных рабочых і калгасьнікаў (да 25 проц.) з актыўнай савецкай, калгаснай грамадзкай работы, якія ўмеюць пісаць, чытаць і лічыць у абёме чатырох дзеі арытмэтыкі;

в) на камсамольскае аддзяленьне прымаюцца члены і кандыдаты КП(б)Б, камсамольцы з 3-хгадовым камсамольскім стажам. Да прыёму дапускаюцца таварышоў па падрыхтаванасьці ў абёме камсамольскай пачатковай школы і 4-хгодкі, ва ўзросьце ня вышэй 20 год.

4. Кантынгент набору на 1933-34 навучальны год зацьвердзіць:

а) па віцебскай саўпартшколе:

2-хгадовае аддзяленьне	30 чал.;
калгаснае аднагадовае аддзяленьне	60 чал.;
камсамольскае аддзяленьне	30 чал.;

б) па гомельскай саўпартшколе:

2-хгадовае аддзяленьне	60 чал.;
калгаснае аднагадовае адд.	60 чал.;
камсамольскае аддзяленьне	30 чал.

У гомельскай саўпартшколе на 2-хгадовым аддзяленьні арганізаваць прапгрупу па падрыхтоўцы штатных прапагандыстаў РК КП(б)Б, у якую прымаць членаў КП(б)Б з 2-хгадовым партстажам, з актыўнай парт. і грамадзкай работай, падрыхтаваных у абёме ВСШП і чатырохгодкі;

в) па менскай саўпартшколе:

2-хгадовае аддзяленьне	30 чал.;
калгаснае 1-гадовае аддзял.	60 чал.;
камсамольскае аддзяленьне	30 чал.

г) у магілеўскую саўпартшколу прыняць 120 чал., усяго 520 чалавек.

Даручыць культпропу ЦК КП(б)Б даць разьвёрстку раёнам па камплектаваньні, выходзячы з прынцыпу прымацаваньня да саўпартшкол асобных вытворчых зон БССР (ільнаводчая зона, бульбяна-жывёлагадоўчая і бульбяна-канапляводная).

5. Для правядзеньня набору арганізаваць пры саўпартшколах мандатныя камісіі ў складзе прадстаўніка ГК, РК КП(б)Б, ГК, РК КСМ і школы. Усю адборачную работу скончыць не пазьней 1 верасьня 1933 г. Заняткі па СПШ распачаць з 1-га кастрычніка 1933 г. Кіраўніцтву саўпартшкол распрацаваць і распаўсюдзіць матар'ялы для падрыхтоўкі да іспытаў паступаючых на вучобу. Абавязаць РК КП(б)Б і ЛКСМБ арганізаваць для камандыруемых падрыхтоўку да прыёмачных іспытаў.

6. Прапанаваць культпропу ЦК і Наркамасьветы (ДВС) перагледзець навучальныя пляны і праграмы саўпартшкол і да пачатку заняткаў забясьпечыць апошнімі ўсе саўпартшколы па асобных дысцыплінах. Распрацаваць праграмы па спэцыяльных дысцыплінах пытаньняў сельскай гаспадаркі (лён, жывёлагадоўля, збожжавыя культуры, бульба, арганізацыя працы ў буйнай сельскай гаспадарцы).

7. Устанавіць па СПШ канцэнтраваную практыку — на 2-хгадовым аддзяленьні на працягу 2-х месяцаў, на 1-гадовым у працэсе вучобы ў прыгарадных калгасах, саўгасах і МТС.

Устанавіць па саўпартшколах перапынкі навучальны год з 15-дзённым перапынкам зімой і паўтарамесячным — летам.

8. Прапанаваць Наркамасьветы своячасова ўкамплектаваць саўпартшколы патрэбнымі пэдкадрамі, прычым асноўныя дысцыпліны забясьпечыць выкладчыкамі, падрыхтаванымі ў абёме асыстэнтаў. Узмацніць навучальную дысцыпліну і якасьць выкладаньня. Арганізаваць плянавую работу прадметных камісій. НКА распрацаваць мэтадычны ліст для саўпартшкол аб мэтадах выкладаньня, прыстасоўна да тэй падрыхтаванасьці і аддзяленьняў, якія арганізуюцца па саўпартшколах.

9. Даручыць Саўнаркому забясьпечыць менскую саўпартшколу патрэбнай навучальнай жыльлёвай плошчай да 1 жніўня.

10. Прапанаваць загадчыкам саўпартшкол арганізаваць пры апошніх сваю ўласную гаспадарку (сталоўка, прыгарадныя гароды, сьвіныя фэрмы і інш.), скарыстаўшы цалкам асыгнаваныя НКА на гэту мэту сродкі.

РАЗЬВЁРСТКА

па камплектаваньні міжраённых саўпартшкол БССР

№ № п-т	РАЁН	2-х гад. аддзял. Арт'ем.	Прац.	Камун.	Б-п	Ка гаснае Камсамол	УСЯГО
	1. ГОМЕЛЬСКАЯ СПШ						
1.	Церахоўскі	1	1	2	1	1	6
2.	Уваравіцкі	1	1	2	1	1	6
3.	Веткаўскі	1	1	2	2	1	7
4.	Буда-Кашалёўскі	1	1	2	1	1	6
6.	Чачэрскі	1	1	2	2	1	7
6.	Кармянскі	1	1	2	1	1	6
7.	Прапойскі	1	1	2	1	1	6
8.	Чэрыкаўскі	1	1	2	1	1	6
9.	Чырвонапольскі	1	1	2	1	1	6
10.	Крычаўскі	2	2	3	2	2	11
11.	Клімавіцкі	3	3	4	3	3	16
12.	Касьцюковіцкі	2	2	3	2	2	11
13.	Старобінскі	1	1	2	1	1	6
14.	Любаньскі	1	1	2	1	1	6
15.	Жыткавіцкі	1	1	2	1	1	6
16.	Тураўскі	1	1	2	1	1	6
17.	Лельчыцкі	1	1	2	1	1	6
18.	Пятрыкоўскі	1	1	3	2	1	8
19.	Глускі	1	1	2	1	1	6
20.	Парыцкі	1	1	2	1	1	6
21.	Ельскі	1	1	2	1	1	6
22.	Мазырскі	4	4	6	3	4	21
23.	Нараўлянскі	1	1	2	1	1	6
24.	Рэчыцкі	4	4	6	3	4	21
25.	Хойніцкі	1	1	2	1	1	6
26.	Брагінскі	1	1	2	1	1	6
27.	Лоеўскі	1	1	2	1	1	6
	ВІЦЕБСКАЯ СПШ						
1.	Асьвея	2	3	2	2	9	
2.	Дрыса	2	3	2	2	9	
3.	Расоны	1	2	1	2	6	
4.	Полацак	4	4	3	4	15	
5.	Вушачы	2	3	2	2	9	
6.	Лепель	3	3	2	3	11	
7.	Чашнікі	2	2	1	2	7	
8.	Талачын	2	2	2	2	8	
9.	Сянно	2	3	2	2	9	
10.	Крупкі	2	2	1	2	7	
11.	Бялынічы	2	2	2	2	8	
12.	Гарадок	3	3	2	3	11	
13.	Сураж	2	2	1	2	7	
14.	Сіроціна	2	2	1	2	7	
15.	Лёзна	2	2	1	2	7	
16.	Бешанковічы	2	2	1	2	7	
17.	Дуброўна	3	4	2	4	13	
18.	Горы	2	2	1	2	7	
19.	Шклоў	3	4	2	5	14	
20.	Чавусы	1	2	1	2	6	
21.	Мсьціслаўе	2	3	2	2	9	
22.	Віцебск	10	7	2	10	29	
23.	Ворша	5	5	2	5	17	
28.	Камарынскі	1	1	2	1	1	6
29.	Гомельскі	10	10	5	2	10	37
30.	Бабруйскі	5	5	3	2	5	20
31.	Магілеўскі	6	6	4	3	6	25

РАЗЬВЁРСТКА

камандыровак у Менскую саўпартшколу

№ № п-т	НАЗВА АРГАНІЗАЦЫЙ	На 1 гадовае калгаснае аддзяленьне У тым ліку: На 2-х гадов. парт. аддзял. Члены і канд. партыі.	Бесп-парт.	На 1 гадовае КСМ	Усяго
1	Асіпавіцкая	3	3	2	4	12
2	Бягомльск.	2	2	1	2	7
3	Бярэзінская	1	1	1	2	5
4	Быхаўская	3	3	2	3	11
5	Вузьдзенск.	1	2	1	3	7
6	Дзяржынск.	3	3	2	3	11
7	Жлобінская	3	3	2	3	11
8	Заслаўская.	1	2	1	2	6
9	Капыльская	1	2	1	2	6
10	Клічаўская.	1	2	1	2	6
11	Лагойская .	1	2	1	2	6
12	Пухавіцкая.	2	2	1	2	7
13	Плешчаніцк.	2	2	1	2	7
14	Рагачоўская	3	3	2	3	11
15	Стара - Дароская . .	1	2	1	2	6
16	Смалявіцкая	1	2	1	2	6
17	Слуцкая . .	4	3	2	3	12
18	Чэрвеньская	1	2	1	2	6
19	Чырвона-Слабодзкая.	1	2	1	2	6
20	Барысаў . .	10	10	3	4	27
21	Менск . . .	15	15	7	10	4
	УСЯГО .	60	68	35	60	

Заг. ЦК культпропу КП(б)Б.

Да гаспадарчай улады Германіі прышой дыктатар манапалістычнага капіталу — міліянэр Тысэн.

Пачынаецца новая паласа жорсткага паходу на рабочую клясу Германіі. (З газэт).

Мал. Вал. МЯДЗЬВЕДЗЕВА.

АБ ПАМОЛЬНЫМ ЗБОРЫ

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР

Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Плата за памол збожжа і за пераапрацоўку яго ў крупу, а таксама за пераапрацоўку сем'я ў алей на ўсіх млынох, мукамольна-крупяных, крупяных і алейных прадпрыемствах незалежна ад іх магутнасьці і ад таго, каму гэтыя прадпрыемствы належаць, бяруцца ў натуральнай форме (памольны збор).

2. Памольны збор бяруцца з усёй колькасьці прывезенага для пераапрацоўкі збожжа.

3. Плата натурай не бяруцца за памол і пераапрацоўку толькі таго збожжа, якое атрымана ў парадку плянавага снабжэньня па нарадах Белкантораў Загатзбожжа.

4. За памол і пераапрацоўку ўсялякага іншага збожжа атрыманага не па нарадах Белкантораў Загатзбожжа, ад спажывецкай кааперацыі саўгасаў, МТС і інш. арганізацый памольны збор бяруцца па стаўках, устаноўленых калгасаў.

5. Устанавіць стаўкі памольнага збору за пераапрацоўку збожжа і алейнага сем'я па паасобных сэктарох у наступных разьмерах:

З 1-го цэнтнэра ў кілёграмах

Род памолу	Для калгасаў і іх членаў	Для аднаасобнага сэктару	Для кулацкіх гаспадарак
1. Жыта звычайны памол	11,0	12,0	13,0
2. » абойны »	14,0	15,0	17,0
3. Пшаніца звычайны »	12,5	14,0	15,0
4. » абойны »	14,0	15,5	17,0
5. Пшаніца гатунк. памол. 80-85 %	19,5	21,5	23,5
6. Іншыя культуры звыч. памол	10,0	11,0	12,0
7. » » абойны »	15,0	16,5	18,0
8. Круша 60-65 %	15,0	16,5	18,0
9. » 50-55 %	20,0	22,0	24,0
10. Алей	27,5	30,0	33,0

6. За памол і пераапрацоўку збожжа, атрыманага памольцамі ў парадку арт. 3-та гэтай пастановы ўстанавіць плату грашыма ў наступных разьмерах (за цэнтнэр у капейках).

Род памолу	Кошт за цэнтнэр
1. Жыта і пшаніца звычайнага памолу	104
2. Жыта і пшаніца абойнага памолу	115
3. Жыта і пшаніца гатунк. 80-85 %	162
4. Іншыя зернавыя звычайнага памолу	115
5. Іншыя зернавыя абойнага памолу	138
6. Круша ячменная 60-65 %	230
7. Круша пшонная і грэчневая 50-60 %	115

7. Мукамольна-крупяныя, крупяныя і алейныя прадпрыемствы павінны здаваць увесь памольны збор адпаведным памолам і культурамі прыёмным пунктам Загатзбожжа, дастаўляючы памольны збор сваім транспартам.

8. Памольны збор, які здаецца мукамольна-крупянымі, крупянымі і алейнымі прадпрыемствамі, аплачваецца Загатзбожжа па дырэктыўнай загатоўчай цане, устаноўленай для данага прыёмнага пункта.

9. Для стварэньня фонда новага будаўніцтва і рэканструкцыі сельска-гаспадарчага мукамольля ўстанавіць, што:

а) Загатзбожжа пры разьліку з мукамольна-крупянымі, крупянымі і алейнымі прадпрыемствамі, апроч дзяржаўных прадпрыемстваў утрымлівае з належачых прадпрыемствам сум 15 проц. з кошту здадзенага імі памольнага збору ў фонд будаўніцтва і рэканструкцыі сельска-гаспадарчага мукамольля і перераводзіць атрыманыя сумы на рахунак трэсту мясцовай мукамольнай прамысловасьці;

б) мукамольна-крупяныя, крупяныя і алейныя прадпрыемствы, апроч дзяржаўных прадпрыемстваў, якія пераапрацоўваюць збожжа і масласемя за грошы, адлічваюць у фонд будаўніцтва і рэканструкцыі сельска-гаспадарчага мукамольля 15 проц. ад фактычна атрыманых сум за перамол збожжа і пералічваюць гэтыя сродкі самастойна на рахунак Беларускага трэста.

10. Фонд новага будаўніцтва і рэканструкцыі сельска - гаспадарчага мукамольля канцэнтруецца пры трэсьце мясцовай мукамольна-крупяной прамысловасьці і выдаткоўваецца паводле палажэньня, якое выдаецца ўпаўнаважаным камітэту загатовак СНК СССР па БССР.

11. Упаўнаважаны камітэту загатовак СНК СССР па БССР, выходзячы з зацьверджанага пляну памольнага збору па БССР, падае на зацьверджэньне СНК БССР план разьмеркаваньня памольнага збору па раёнах, а райённы ўпаўнаважаны камітэту загатовак па ўзгадненьні з раённымі выканаўчымі камітэтамі вызначаюць для кожнага паасобнага млына-крупянога, крупянага і алейнага прадпрыемства мінімальны разьмер памольнага збору, які падлягае здачы на працягу сельска-гаспадарчага году (з 1 ліпеня па 1 ліпеня) з паказаньнем культур, тэрміну і месца здачы.

12. Уладары, або арандатары мукамольна-крупяных, крупяных і алейных прадпрыемстваў могуць абскарджаць вызначаны для іх разьмер памольнага збору на працягу 5-ці дзён з дня ўручэньня ім паведамленьня аб мінімальным разьмеры памольнага збору ў прэзыдыум раённага выканаўчага камітэту, які разглядае скаргі ў трохдзённы тэрмін пры ўдзеле раённага ўпаўнаважанага камітэту загатовак. Пастанова, узгодненая прэзыдыумам раённага выканаўчага камітэту з раённым упаўнаважаным камітэту па загатоўках зацьвярджаецца калегіяльнай, далей яна можа быць абскарджана і паведамляецца скаргніку.

Калі ёсьць разнагалосьдзе паміж прэзыдыумам раённага выканаўчага камітэту і раённым упаўнаважаным камітэту па загатоўках пытаньне перадаецца на вырашэньне ўпаўнаважанага камітэту загатовак СНК СССР па БССР.

Абскарджаньне не адлажае ўладароў, альбо арандатараў вышэйпаказаных прадпрыемстваў ад здачы належачага з іх памольнага збору, калі аб зьніжэньні здачы памольнага збору ня было спэцыяльнага паведамленьня.

13. Калі памольны збор ня будзе здан у належных разьмерах і культурах у тэрміны, паказаныя ў паведамленьні раённага ўпаўнаважанага камітэту загатовак — памольны збор спаганяецца натурай ў бясспрэчным парадку па распараджэньні раённага ўпаўнаважанага камітэту загатовак або кантралёра па памольнаму збору.

14. За незаконнае выдаткаваньне паступўшага памольнага збору, уласьнікі прыватных прадпрыемстваў, а таксама службовыя асобы дзяржаўных, кааперацыйных і інш. грамадзкіх прадпрыемстваў прыцягваюцца да крымінальнай адказнасьці паводле пастановы ЦВК і СНК СССР ад 7-га жніўня 1932 году «Пра ахову маемасьці дзяржаўных прадпрыемстваў, калгасаў і кааперацыі і ўмацненьне грамадзкай сацыялістычнай уласнасьці» (З. З. СССР, 1932 г., № 62, арт. 360).

15. За іншыя парушэньні правіл аб памольным зборы (неспагнаньне памольнага збору з памольцаў, самавольнае зачыненьне прадпрыемства, парушэньне ўстаноўленых ставак памольнага збору, замена адных культур другімі, адмаўленьне ад дастаўкі памольнага збору на прыёмныя пункты Загатзбожжа, указаныя ў паведамленьні, і інш.) уладары або арандатары прадпрыемстваў прыцягваюцца да крымінальнай адказнасьці паводле арт. 152 крымінальнага кодэксу.

Апроч гэтага, кааперацыйныя і інш. грамадзкія арганізацыі, якім належаць прадпрыемствы, дзе былі дапушчаны парушэньні правіл аб памольным зборы, а таксама ўласьнікі і арандатары прыватных прадпрыемстваў па распараджэньню ўпаўнаважанага камітэту загатовак СНК СССР па БССР прыцягваюцца да штрафу ў натуральнай форме (збожжам) у межах недаатрыманага дзяржавай памольнага збору.

16. Ва ўсіх выпадках выяўленьня ўсялякага роду тайнага памолу збожжа на млына-крупяных, крупяных і алейных прадпрыемствах або перамол збожжа на ручных і інш. хатніх жарнавох, пінаватых прыцягваць да крымінальнай адказнасьці, паводле арт. 94 крымінальнага кодэксу БССР.

17. З выданьнем гэтай пастановы скасаваць пастанову СНК БССР ад 8-га сьнежня 1932 г. «Пра памольны збор» (З. З. БССР 1932 г. № 70, паст. 351 1933 г. № 1, паст. 8).

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР — М. ГАЛАДЗЕД.

Кіраўнік спраў Савету Народных Камісараў і ЭКАСА БССР — С. КАНДЫБОВІЧ.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

Узмацненьне тэрору супроць рэвалюцыйных элемэнтаў

ПАРЫЖ, 22 (Белта). Газэты аддаюць шмат увагі сакрэтнай нарадзе, скліканай **Герынгам** на востраве Зылт, нечаканаму звароту Герынга ў Бэрлін і назначанай на заўтра ў Бэрліне нарадзе кіраўнікоў атрадаў штурмавікоў. Агэнцтва Гавас непакоіцца пацыянал-сацыялістскіх лідэраў тлумачыць хваляваньнямі, якія адбыліся ў апошнія дні ў некалькіх гарадох Германіі ў атрадах штурмавікоў, расчараваных у палітыцы Гітлера. У **Бэйтзне** патрабавалася нават умяшаньне рэйхсвэру для ўціхамірваньня штурмавікоў. У **Франкфурце** на Майне, у **Дусэльдорфе** і ў **Эсэне** штурмавыя атрады, як паведамляюць газэты былі распушчаны за «сацыялістычную прапаганду». У **Гамбургу** штурмавыя атрады занялі «карычневы дом». У **Нюрэмбургу** адбыліся настолькі сур'ёзныя выступленьні, што сам Гітлер павінен быў паспешна выехаць на месца. Газэты падкрэсьліваюць, што галоўная мэта падыходзячых нарад — узмацненьне тэрору супроць камуністаў і рэвалюцыйных элемэнтаў.

Напружанае становішча на аўстра-германскай граніцы

БЭРЛІН, 23 (ТАСС). **«Бэрлінэр Бэрзэнцэйтунг»** паведамляе аб канцэнтрацыі аўстрыйскіх войск каля германскай граніцы. Атрад альпійскіх стралкоў, які знаходзіўся ў **Лінцэ**, пераведзен у **Шэрдынг**. У **Зальцбург** накіроўан атрад стралкоў з Нейзэдэля. У **Куфштэйне** размешчан атрад альпійскіх стралкоў з Халя. Па словах газэты, гэтыя меры зьвязаны з тым, што штурмавыя атрады неаднаразова пераходзілі граніцу з Баварыі ў Аўстрыю.

Абгаварваюць новыя драконаўскія меры супроць рабочых

БЭРЛІН, 22 (Белта). Учора на востраве **Зылт** (на Балтыцкім моры) у адпачываўшага там прускага прэм'ера **Герынга** адбылася тайная нарада, на якой прысутнічалі прускі міністр юстыцыі **Керль**, статс-сакратары **Керзэр** і **Фрэйзлер**, начальнік дзяржаўнай тайнай паліцыі **Гільс** і інш. Гэтая нарада павінна была абмеркаваць намечаныя ўрадам суровыя меры супроць «варожых дзяржаве выступленьняў». Сёньня Герынг спыніў свой водпуск і вярнуўся ў Бэрлін.

Адначасова сёньня адбудзецца пашыраная нарада з удзелам начальніка штаба штурмавых атрадаў **Рэма** і ўсіх кіраўнікоў штурмавых груп, на якой таксама будуць абмяркоўвацца новыя мерапрыемствы ўраду па барацьбе з крамолай.

Новыя драконаўскія законы ўраду ў першую чаргу накіраваны супроць рэвалюцыйных рабочых. Разам з тым новыя законы маюць на мэце прыдушэньне выступленьняў бунтуючых элемэнтаў унутры нацыянал-сацыялісцкай партыі і штурмавых атрадаў.

ЗА МЯЖОЙ

Новы законапраект аб пакараньні сьмерцю

БЭРЛІН, 22. (Белта). Прускі савет міністраў пастанавіў унесьці на зацьверджаньне Усягерманскага ўраду законапраект, які ўпаўнаважвае надзвычайныя суды выносіць сьмяротныя прыгаворы ў выпадку нападзеньняў на штурмавікоў і паліцэйскіх, а таксама ў тых выпадках, калі справа датычыць падрыхтоўкі так званай **«прапаганды жахаў»** у Германіі.

Як прыводзіць прадстаўнікоў друку **Герынг** вымушан быў адкрыта прызнаць, што **«дзяржаўны вораг быў толькі па відочнасьці перамжан»** і што **«камунізм зноў нагней чым калі-небудзь, падымае сваю галаву»**.

Для вынесеньня сьмяротнага прыгавору даволі будзе доказу, што замахвалец толькі меў намер зрабіць нападзе на нацыянал-сацыяліста, а таксама што падпаўны нападу ня быў забіт, а толькі паранен.

Для паскарэньня і «сапраўднасьці» судовага разбору прускі ўрад парашыў стварыць цэнтральную пракуратуру, якая непасрэдна падначалена міністру юстыцыі і будзе працаваць у цесным кантакце з дзяржаўнай тайнай паліцыяй.

Ня гледзячы на тое, што новыя драконаўскія законы яшчэ ня выданы, яны фактычна ўжо ажыцьцяўляюцца. Гэтымі днямі ў Гамбургу быў вынесен сьмяротны прыгавор двум рэвалюцыйным рабочым, якія прымалі ўдзел у сутычцы з фашыстамі. У Кольні да кары сьмерці прыгавораны 6 рэвалюцыйных рабочых, якія ў бойцы з фашыстамі нібыта забілі двух штурмавікоў.

ЗАМЕЖНАЯ ХРОНІКА

* Як паведамляе газэта «Сацыял-дэмакрат», 16-га ліпеня ў Брэслаўлі адбылося дэманстрацыя штурмавікоў, якія патрабавалі выкананьня абяцаньняў нацыянал-сацыялісцкіх лідэраў пры іх прыходзе да ўлады. Паліцыя адкрыла па дэманстрантах агонь, забіўшы 7 і раніўшы 10 чалавек.

* З добраінфармаваных крыніц перадаюць, што «Тытуэску сёньня прыбыў у Вэнэцыю для адпачынку». Паведамляюць, што ня выключана магчымасьць яго сустрэчы з **Мусаліні** па-за Рымам.

* Дырэкцыя буйнейшага ў Верхняй Сілезіі мэталюргічнага заводу «Гута Крулевска» паведаміла аб звальненьні ўсіх рабочых і служачых. Работу трацяць 1700 рабочых і 127 служачых.

Не чакайце апошніх дзён падпіскі

НА ГАЗЭТЫ:

„ЗЬВЯЗДА“ Орган ЦК і Мен. ГК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

„ОРКА“ (на польскай мове) Орган ЦК КП(б)Б

„РАУДОНАСІС АРТОЯС“ (на літоўскай мове) Орган ЦК КП(б)Б

НА ЧАСОПІСІ

„БАЛЬШАВІК БЕЛАРУСІ“ Орган ЦК КП(б)Б

„БАЛЬШАВІЦКІ ДРУК“ Часопісь культпропу ЦК КП(б)Б

„Работніца і Калгасьніца БССР“ Выданьне ЦК КП(б)Б

ПАМЯТАЙЦЕ, ЦІТО СВАЯЧАСОВАЯ ЗДАЧА ПАДПІСКІ ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА ЛЕПШАЙ ГАРАНТЫЯЙ АКУРАТНАЙ ДАСТАЎКІ ГАЗЭТ І ЧАСОПІСЯЎ.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА: у Менску—Менгарбюро Саюздруку (Ленінская 34, 2-гі паверх) з 9 г. раніцы да 9 г. веч. тыражнымі работнікамі Саюздруку, у іншых гарадох і раёнах БССР— гарадзкімі і сельскімі лістаносцамі, якія маюць на гэта пасьведчаньне, усімі паштовымі агэнцтвамі, а таксама ўсімі кіёскамі па продажы газэт

ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА Касы—ад 1 г. дня: Вялікі мастацкі замежны фільм **У ІМЯ КАХАНЬНЯ**

ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ: Мастацкі фільм **ДЗІЦЯ ДЗЯРЖЦЫРКУ**

Пралетары: ПАТ І ПАТАЎШОН у камэдыі **„Ахоўнікі парадку“**

СПАРТАК Касы—з 3 г. 30 м.: Выдатны фільм **Дзяўчына са скрынкай** камэдыя ў 6 частках

ДЗІЦЯЧЫ ГУЛАВЫ кіно-тэатр: Лепшы мастацкі прыгодніцкі фільм **УЛАДАР СЬВЕТУ** ў 7 частках.

Мядтэхнікум—больніца пры інстытуце ўдасканаленьня мэдкадраў АБВЯШЧАЕ **асеньні НАБОР** студэнтаў на 1-ы курс на аддзяленьні: зубных дактароў, тэхнікаў—акушэрак і клінічных лябарантаў. Студэнты забясьпечваюцца пітаньнем і сталоўкай.

Прыём заяў с дакумантамі аб сац. паходжаньні, саціс'ненішчы, аб узросьце, аб адукацыі, на ніжэй 7-годні праводзіцца **да 20 жніўня.**

Даведкі штодзенна з 12 г. дня да 5 г. ў канцылярыі тэхнікуму—Менск, Клінгарадок, 11 корпус, тэл. 20-770.

ДЫРЭКЦЫЯ.

ГОМЕЛЬСКІ фінансава-вучотны тэхнікум абвяшчае АСЕНЬНІ НАБОР студэнтаў на 1-шы курс крэдытна - банкаўскага аддзяленьня.

Тэхнікум рыхтуе эканамістаў, бухгальтароў і кіруючых працаўнікоў рахункова га апарату раённых філіялаў Дзяржбанку.

Тэрмін навучаньня 3 гады.

Прыём заяў да 15 жніўня, а з 20 жніўня паступаючыя трымаюць іспыты па грамадазнаўстве, матэматыцы, фізыцы, хэміі і беларускай мове ведаў 7-годкі. Да заяў патрэбна прыкласьці (у арыгіналах) наступныя дакумэнты: засьведчаную анкету, дакумэнт аб узросьце, аб адукацыі, аб сацыяльным паходжаньні і становішчы (для сялян-адзіначосбікаў даведку аб сельгас. падатку на 1933 г.), аб здароўі, 2 фота-карткі, таксама на 40 кап. паштовых марак для адказу.

Залічаныя забясьпечваюцца інтэрнатам. Стыпэндыяй забясьпечваюцца на агульных падставах у залежнасьці ад пасьпяховасьці.

Заняткі ў тэхнікуме пачнуцца 1-га верасьня.

Заявы падаваць па адрасе: Гомель, Чырвоноармейская № 5, фінансава-вучотны тэхнікум.

Дырэктар тэхнікуму **БУХМАН.**

Менскі гідратэхнікум абвяшчае **НАБОР** студэнтаў

Тэхнікум рыхтуе тэхнікаў-мэліяратараў і тэхнікаў па выдавазбясьпячэньню для сацыялістычнай сельскай гаспадаркі.

Прыём праводзіцца на наступныя аддзяленьні:

1. Мэліярацыйнае—60 асоб.
2. Водазабясьпячэньня—30 асоб.
3. Вячэрняе аддзяленьне без адрыву ад вытворчасьці—30 асоб.

У тэхнікум прымаюцца асобы ва ўзросьце ад 16—25 гадоў і на вячэрняе аддзяленьне ад 16—35 гадоў. Усе паступаючыя павінны трымаць іспыты за курс сямігодкі па грамадазнаўстве, па роднай мове, матэматыцы, фізыцы і хэміі. Для паступаючых на вячэрняе аддзяленьне патрэбна адукацыя ня ніжэй 6-ці груп сямігодкі, ад іспытаў ні хто невызваляецца. Усе прыведзеныя студэнты, як на дзённае, так і на вячэрняе аддзяленьні забясьпечваюцца інтэрнатам. Стыпэндыяй забясьпечваюцца студэнты па пасьпяховасьці, згодна пастановы ЦВК СССР ад 7 ліпеня 1932 г. Студэнты вячэрняга аддзяленьня стыпэндыі не атрымліваюць, пры чым, тых мінут бяро на сябе прыстасаваньне на работу прыежджых, якія будуць навучацца на вячэрнім аддзяленьні. Пры тэхнікуме ёсьць сталоўка. Тэрмін навучаньня ў тэхнікуме 3 з палов. гады, на вячэрнім аддзяленьні 4 гады. Заявы прымаюцца да 10 жніўня. Да заяў па вінны быць далучаны наступныя дакумэнты: анкета, матрычная выпіска, пасьведчаньне аб адукацыі, аб сацыяльным і матар'яльным становішчы пасля паючага і яго бацькоў, зараз і да рэвалюцыі, аб адносінах да вайсковай павінасьці, аб вытварчым стажы, аб стане здароўя, 2 фотакарткі і на 40 кап. паштовых марак. Для паступаючых на вячэрняе аддзяленьне—даведку аб вод пуску на вучобу.

Заявы накіроўваюцца па адрасе: г. Менск, Дрэзавпрацоўчая вул., дом № 59-17а.

Дакумэнты прымаюцца толькі ў арыгіналах.

Іспыты для паступаючых з 15 па 20 жніўня. Заняткі пачнуцца з 1-га верасьня.

Дырэктар Гідратэхнікуму **М. Маўрыд.**

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ палітэхнічны інстытут, арганізуемы на базе Інстытутаў энергетычнага, будаўнічага, тарфянога, хэміка-тэхналягічнага, харчавога і водамэліярацыйнага **абвяшчае АСЕНЬНІ НАБОР** на наступныя факультэты і аддзяленьні:

Факультэт энергетычны з аддзяленьнямі: электра-энергетычнае, цепла-тэхнічнае.

Факультэт будаўнічы з аддзяленьнямі: прамыслова - жыльлёвага будаўніцтва, дарог і аэрэдромаў.

Факультэт хіміка - тахналягічны з аддзяленьнямі: сілікатным, шкляным.

Факультэт торфа-мэліярацыйны з аддзяленьнямі: гідра-тэхнічным, іншы корпус-вытворчым, торфа - тэхналягічным, геадэзычным.

Падаючыя заявы павінны паказаць: на які факультэт, на якое аддзяленьне, яны жадаюць паступіць. Да заяў павінны быць прыкладзены: а) заверная анкета, б) даведка аб сацыяльным становішчы і паходжаньні, в) даведка аб працоўным стажы, г) пасьведчаньне аб адукацыі (арыгінал), д) даведка аб узросьце і адносінах да вайсковай павінасьці, е) 2 фотакарткі, ж) паштовыя маркі на 40 кап.

Заявы, пададзеныя непасрэдна